ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 46 (2406)
13 чэрвеня 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Учора ў Мінску пачала сваю работу шостая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі сёмага склікання.

У парадак дня сесіі ўключаны наступныя пытанні:

1. Аб стане і мерах па далейшым паляпшэнні меліярацыйных работ і выкарыстання асушаных зямель у рэспубліцы.

2. Аб праекце Кодэкса аб шлюбе і сям'і Беларускай ССР.

3. Аб рабоце камісіі па камунальнай гаспадарцы, добраўпарадкаванні і дарожным будаўніцтве Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

4. Зацвярджэнне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

З дакладам аб стане і мерах па далейшым паляпшэнні меліярацыйных работ і выкарыстання асушаных зямель у рэспубліцы выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутат У. Е. Лабанок.

З садакладам камісіі па сельскай гаспадарцы Вярхоўнага Савета БССР выступіў старшыня гэтай камісіі дэпутат Д. М. Туравец.

АБКОМ ПАРТЫІ АБМЯРКОЎВАЕ ПЫТАННІ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Бюро Гомельскага абкома КПБ абмеркавала пытанне аб паляпшэнні эстэтычнага выхавання працоўных вобласці.

У прынятай пастанове адзначаецца, што ў апошні час партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі, установы культуры і мастацтва, аддзяленні творчых саюзаў вобласці сталі аддаваць больш увагі пытанням эстэтычнага выхавання. У гарадах і раёнах Гомельшчыны часцей цяпер чытаюцца лекцыі, праводзяцца масавыя мерапрыемствы, якія спрыяюць фарміраванню высокіх эстэтычных ідэалаў і маральных якасцей у савецкага чалавека, прапагандуюць лепшыя творы літаратуры і мастацтва. Выхаванне моладзі на рэвалюцыйных і працоўных традыцыях, шырокая прапаганда новых грамадзянскіх абрадаў, рух за высокую культуру быту — асноўны змест работы клубаў, бібліятэк, калектываў мастацкай самадзейнасці, установаў мастацтва і творчых арганізацый.

Палепшылася мастацкае абслугоўванне насельніцтва, часцей сталі праводзіцца сустрэчы з пісьменнікамі, мастакамі, архітэктарамі, артыстамі. Пэўных поспехаў дамагліся работнікі кінафікацыі і пракату.

Разам з тым, бюро абкома партыі адзначыла многа недахопаў у эстэтычным выхаванні працоўных. У некаторых раёнах культурна-асветныя ўстановы працуюць абыякава, нецікава, не ўлічваюцца запатрабаванні і схільнасці розных груп насельніцтва. У Акцябрскім, Нараўлянскім, Кармянскім раёнах слаба развіваецца самадзейнае мастацтва, не наладжана шырокая прапаганда сучаснай масавай песні і бытавога танца. Як вынік гэтай няўвагі ў рэпертуар самадзейных артыстаў часам трапляюць творы нізкай якасці.

Многа недахопаў ёсць у прапагандзе мастацкай літаратуры. Яшчэ недастаткова выкарыстоўваецца кіно — магутны сродак выхавання моладзі і г. д.

Бюро абкома КПБ намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў, паляпшэнні эстэтычнага выхавання працоўных вобласці.

Л. ЛАЗАРАЎ,
намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкома партыі.

МІЖНАРОДНАЯ НАРАДА КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ

НАША СІЛА — У ЕДНАСЦІ

Увесь свет з неаслабнай увагай сочыць за работай міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый у Маскве.

Савецкія людзі, нашы сябры за мяжой выказваюць сваю ўпэўненасць, што Нарада прывядзе да новага згуртавання камуністаў планеты, усіх антыімперыялістычных сіл.

Савецкі народ, усе людзі добрай волі на зямлі адзінадушна адабраюць прамову Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, у якой выкладзена ясная і прынцыповая пазіцыя, пазіцыя бязмежнай адданасці нашай партыі ідэалам камунізма, ленінскім ідэям пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Да магутнага народнага голасу адабрэння палітыкі нашай роднай камуністычнай партыі далучаюць свае галасы работнікі культуры, літаратуры і мастацтва.

У тэлеграмах і пісьмах у адрас Нарады яны выказваюць пачуцці адданасці справе Леніна, жадаюць удзельнікам Нарады плённай работы.

— Пісьменнікі Беларусі горача і сардэчна вітаюць удзельнікаў міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый, — гаворыцца ў тэлеграме Саюза пісьменнікаў БССР. — Мы цвёрда верым, што міжнародны форум камуністаў адыграе вялікую ролю ў далейшай актывізацыі інтэрнацыянальнай арміі змагароў супраць імперыялізму...

— Пытанні, якія абмяркоўваюцца на Нарадзе камуністычных і рабочых партый, — пішуць у сваёй тэлеграме беларускія мастакі, — хвалююць таму, што ўсе сумленныя людзі на зямлі свае надзеі на мір, на шчасце звязваюць з паспяховай дзейнасцю камуністычных і рабочых партый, з іх барацьбой з цёмнымі сіламі імперыялізму.

ПАДТРЫМЛІВАЕМ!

Бываюць падзеі, якія злучаюць мільёны сэрцаў у адно вялікае магутнае сэрца. Такою падзеяй з'яўляецца міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый, якая праходзіць цяпер у Маскве.

З асаблівай увагай савецкія людзі пазнаёміліся з выступленнем Л. І. Брэжнева, якое раскрыла велічную карціну барацьбы працоўных усіх краін з сусветным імперыялізмам. Наша Савецкая краіна была, ёсць і будзе апорай усіх свабодалюбівых народаў. Ворагі свабоды і прагрэсу, якія вядуць вайну супраць нашай ідэалогіі, імкнуцца раскалоць камуністычны рух. Іх падкопам процістаіць палітыка нашай партыі, палітыка правільная і мудрая. Увесь савецкі народ гуртуецца вакол сваёй партыі, падтрымлівае яе цвёрдую палітычную лінію.

Нам, салдатам ідэалагічнага фронту, работнікам культуры і мастацтва, патрэбна заўсёды быць пільнымі, адбіваць своечасова ўсе вылазкі буржуазіі з яе ўбогім хламам неамяшчанскіх ідэй.

Мы, памочнікі партыі, усе свае творчыя сілы накіруем на барацьбу з імперыялізмам і яго скрытымі і яўнымі сіламі.

Будзем аберагаць чысціню нашай камуністычнай ідэалогіі і маралі!

Р. ШЫРМА,
народны артыст СССР.

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, СВАБОДУ І МІР В'ЕТНАМУ!

ЗАКЛІК МІЖНАРОДНАЙ НАРАДЫ КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ

Міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый шле брацкаму в'етнамскаму народу палымянае баявое прывітанне і ад усяго сэрца віншуе яго з гістарычнымі поспехамі ў барацьбе супраць агрэсіі ЗША.

Сваё асаблівае прывітанне мы шлём авангарду в'етнамскага народа, Партыі працоўных В'етнама і яе Цэнтральнаму Камітэту, вялікаму патрыёту і інтэрнацыяналісту таварышу Хо Шы Міну, выдатнаму дзеячу міжнароднага камуністычнага руху. Партыя працоўных В'етнама—гэта натхняючая і кіруючая сіла ў барацьбе супраць агрэсіі імперыялізму ЗША. Яна паслядоўна абараняе нацыянальныя інтарэсы і фарпост сацыялізма ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

Мы шлём сваё гарачае прывітанне Нацыянальнаму фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама, законнаму прадстаўніку насельніцтва Паўднёвага В'етнама, выпрабаванаму арганізатару і правадыру ў гераічнай барацьбе Супраціўлення супраць агрэсіі ЗША. Палітычная праграма Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама з'яўляецца асновай яднання ўсяго паўднёва-в'етнамскага насельніцтва ў яго справядлівай вызваленчай барацьбе.

Міжнародная Нарада безагаворачна падтрымлівае выстаўленую 8 мая 1969 г. Цэнтральным Камітэтам Нацыянальнага фронту вызваленых Паўднёвага В'етнама праграму з 10 пунктаў «Прынцыпы і змест агульнага вырашэння паўднёва-в'етнамскай праблемы з мэтай садзейнічання аднаўленню міру ў В'етнаме».

Гэта праграма зыходзіць з асноўных прынцыпаў Жэнеўскага пагаднення 1954 г. па В'етнаму і з цяперашняга становішча ў В'етнаме. Яна базіруецца на палітычнай праграме і пазіцыі Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама, якая складаецца з 5 пунктаў, і адпавядае пазіцыі ўрада Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам з 4-х пунктаў. Прапанаванае вырашэнне паўднёва-в'етнамскай праблемы поўнасцю адпавядае нацыянальным правам в'етнамскага народа і інтарэсам міру ва ўсім свеце. Яно гарантуе права на самавызначэнне паўднёва-в'етнамскага насельніцтва і трывалы мір у В'етнаме, адпавядае таксама інтарэсам іншых народаў Індакітая.

Права в'етнамскага народа весці барацьбу ў абарону сваёй айчыны — гэта свяшчэннае і недатыкальнае права ўсіх народаў на самаабарону.

Барацьба в'етнамскага народа за свабоду і незалежнасць выклікае ў народаў пачуццё глыбокай павагі і захаплення. Стойкасць, гераізм і ўпэўненасць в'етнамскага народа ў сваёй перамозе з'яўляюцца прыкладам і стымулам у барацьбе супраць імперыялізму, за захаванне міру, за вызваленне народаў ад эксплуатацыі і прыгнечання. Абараняючы сваю радзіму, в'етнамскі народ адначасова выконвае свой інтэрнацыянальны абавязак і служыць высакароднай справе забеспячэння міру ва ўсім свеце. У гэтай глыбока справядлівай барацьбе в'етнамскага народа мы цвёрда і салідарна стаялі, стаім і будзем стаяць на яго баку.

Гераічная барацьба в'етнамскага народа супраць агрэсіі ЗША з'яўляецца адной з важнейшых састаўных частак сусветнай барацьбы паміж сацыялізмам і імперыялізмам, паміж сіламі прагрэсу і рэакцыі.

Ажыццяўляючы ўзброеную інтэрвенцыю ў В'етнаме, імперыялістычныя сілы ЗША зрабілі спробу разбіць адзін з сацыялістычных фарпостаў у Азіі, перагарадзіць народам Індакітая шлях да міру, свабоды і прагрэсу, нанесці ўдар па рэвалюцыйнаму нацыянальна-вызваленчаму руху ў Азіі, Афрыцы і Лацінскай Амерыцы, выпрабаваць трываласць салідарнасці сацыялістычных краін і ўсіх антыімперыялістычных сіл.

Гэтыя планы імперыялізму ЗША асуджаны на правал.

Пры велізарнай падтрымцы краін сацыялізма, у першую чаргу Савецкага Саюза, а таксама ўсіх міралюбівых народаў свету в'етнамскі народ паказаў ЗША, гэтай найбольш магутнай сіле імперыялізму, што іх магутнасць не бязмежная.

Варварскія злачынствы амерыканскіх інтэрвентаў супраць в'етнамскага народа, выкарыстанне біялагічных, хімічных і іншых сродкаў масавага знішчэння — гэты ў сапраўдным сэнсе слова генацыд — абураюць сумленне чалавецтва. Яны раскрылі перад усімі народамі сапраўдную, антыгуманную сутнасць імперыялізму.

Усё гэта прывяло да растучай палітычнай і маральнай ізаляцыі агрэсара ў самых шырокіх слаях, уключаючы кіруючыя колы некаторых капіталістычных краін. У саміх ЗША ўсё больш шырокія колы насельніцтва выступаюць супраць бруднай вайны ў В'етнаме, вынікі якой узрушаюць амерыканскае грамадства.

Гераічная эпапея в'етнамскага народа з'яўляецца адным з вызначаючых фактараў руху народаў супраць імперыялізму, які знаходзіць таксама сваё выражэнне ў баявых дзеяннях моладзі і студэнтаў.

Нягледзячы на выкарыстанне гіганцкай ваеннай машыны, агрэсар аказаўся вымушаным без усякіх умоў спыніць бамбардзіроўкі тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і пайсці на чатырохбаковыя перагаворы пры раўнапраўным удзеле Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама. У Паўднёвым В'етнаме народна-вызваленчыя ўзброеныя сілы няспынна наносяць цяжкія ўдары па інтэрвентах ЗША і іх марыянетках. На пераважнай частцы тэрыторыі ўстаноўлена ўлада народа. Збанкрутаваны марыянетачны рэжым трымаецца толькі на штыках імперыялізму ЗША.

Гэта — важныя поспехі гераічнага в'етнамскага народа, сусветнай сістэмы сацыялізма, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, усіх міралюбівых і прагрэсіўных сіл.

Паспяховая барацьба В'етнама адлюстроўвае змены ў міжнародных суадносінах сіл, растучую магутнасць сіл сацыялізма, дэмакратыі і нацыянальнага вызвалення ў сусветным маштабе.

У шырокім руху ў падтрымку В'етнама супраць агрэсіі ЗША знайшло сваё яркае і канкрэтнае выражэнне імкненне міжнароднага камуністычнага руху, а таксама ўсіх антыімперыялістычных сіл да згуртавання і адзінства дзеянняў у барацьбе супраць агульнага ворага чалавецтва — імперыялізму.

Барацьба в'етнамскіх патрыётаў паказвае: **народ, які паслядоўна змагаецца супраць імперыялізму, за свабоду і незалежнасць і на баку якога стаяць Савецкі Саюз, усе сацыялістычныя краіны і міралюбівыя сілы ва ўсім свеце,—непераможны.**

Чым мацнейшыя адзінства і згуртаванасць міжнароднага камуністычнага руху і ўсіх антыімперыялістычных сіл у барацьбе супраць агульнага ворага, імперыялізму, тым большыя іх поспехі.

Чым больш рашуча камуністычныя і рабочыя партыі ўзнімаюць сцяг абароны свабоды народаў і становяцца на чале барацьбы супраць імперыялістычнай палітыкі агрэсіі, тым шырэй і больш дзейска развіваецца антыімперыялістычны рух народных мас.

Нягледзячы на свае цяжкія паражэнні, мілітарыстскія колы ЗША яшчэ не адмовіліся ад агрэсіўных неакаланіялісцкіх планаў адносна В'етнама і працягваюць свае спробы дабіцца вырашэння в'етнамскага пытання ваенным шляхам. Яны ўпарцяцца на сваім небяспечным шляху расшырэння ваеннага канфлікту, як гэта даказваюць бамбардзіроўкі тэрыторыі Лаоса, якія ўзмацняюцца, і пастаянныя правакацыі супраць нейтральнай Камбоджы.

Урад ЗША і яго прадстаўнікі ў Парыжы ўпарта адмаўляюцца па дзелавому і рэалістычна весці перагаворы аб справядлівых патрабаваннях урада Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама, у першую чаргу адносна поўнага і безагаворачнага вываду войск ЗША і іншых узбраенных сіл з Паўднёвага В'етнама. Замест гэтага яны спрабуюць пры дапамозе дэмагагічных манеўраў дэзарыентаваць міжнародную грамадскасць і шляхам нацыску дабіцца за сталом перагавораў поспехаў, якіх яны не дасягнулі на полі бою.

Яны ўхіляюцца ад вырашэння асноўнага пытання аб поўным і безагаворачным выводзе войск ЗША і іх сатэлітаў з Паўднёвага В'етнама і настойваюць на так званым узаемным выводзе войск. Тым самым агрэсар ставіцца на адну дошку з ахвярай агрэсіі. Аднак імперыялізму ЗША ніколі не ўдасцца завуаліраваць той факт, што ён развязаў і ўпарта працягвае агрэсію ў В'етнаме.

Амерыканская інтэрвенцыя ў В'етнаме з'яўляецца пастаяннай пагрозай міру ва ўсім свеце, прамым выклікам усім народам, якія змагаюцца за мір, нацыянальную незалежнасць, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс. Міжнародны камуністычны і рабочы рух, верны прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізму, будзе і надалей у духу брацкай салідарнасці аказваць в'етнамскаму народу ўсю неабходную дапамогу аж да канчатковай перамогі яго справядлівай справы. Тым самым камуністычныя і рабочыя партыі ўносяць вялікі ўклад у справу міру ва ўсім свеце, у справу свабоды і сацыялізма.

Міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый заяўляе з усёй рашучасцю, што справядлівае вырашэнне в'етнамскай праблемы магчыма толькі на аснове забеспячэння асноўных нацыянальных правоў в'етнамскага народа.

Цяпер, калі барацьба в'етнамскага народа ўступіла ў важны этап, калі дзякуючы ініцыятывам Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам і Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама створаны ўсе неабходныя ўмовы для справядлівага палітычнага ўрэгулявання, мы патрабуем:

— ЗША павінны адмовіцца ад сваёй абструкцыянісцкай пазіцыі на чатырохбаковай канферэнцыі ў Парыжы;

— ЗША павінны неадкладна спыніць свае агрэсіўныя дзеянні ў В'етнаме, поўнасцю і безагаворачна вывесці з Паўднёвага В'етнама свае войскі, таксама як і войскі сваіх сатэлітаў;

— ЗША павінны прызнаць за насельніцтвам Паўднёвага В'етнама права самастойна вырашаць свае ўнутраныя справы без замежнага ўмяшання;

— ЗША павінны пакласці канец любым дзеянням, накіраваным супраць суверэнітэту і бяспекі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам;

— ЗША павінны пакончыць са сваім умяшаннем і агрэсіяй у Лаосе, спыніць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Камбоджы, прызнаць яе граніцы, адмовіцца ад сваіх агрэсіўных мэт у адносінах да дзяржаў Паўднёва-Усходняй і Усходняй Азіі і строга захоўваць Жэнеўскія пагадненні 1954 і 1962 гг.

Мы патрабуем, каб Таіланд, Новая Зеландыя, Аўстралія і паўднёвакарэйскі марыянетачны рэжым, а таксама Федэратыўная Рэспубліка Германія і Японія спынілі свой адкрыты або завуаліраваны ўдзел у агрэсіі ЗША ў В'етнаме!

Ад імя шматмільённай арміі камуністаў мы звяртаемся з заклікам да ўсіх сумленных людзей, да ўсіх, каму дарагія мір, справядлівасць, свабода і незалежнасць народаў:

Яшчэ больш рашуча ўзнімайце ва ўсім свеце голас пратэсту супраць злачыннай вайны амерыканскага імперыялізму ў В'етнаме!

Яшчэ больш актыўна ўдзельнічайце ў міжнародным руху салідарнасці з гераічным в'етнамскім народам!

Патрабуйце вываду войск ЗША і іх сатэлітаў з В'етнама!

Патрабуйце неадкладнага мірнага вырашэння в'етнамскага пытання на аснове забеспячэння неад'емных правоў в'етнамскага народа!

Падтрымлівайце 10 пунктаў Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама!

Мы заклікаем неадкладна разгарнуць новыя разнастайныя, яшчэ больш магутныя і каардынаваныя дзеянні антыімперыялістычных і міралюбівых сіл у падтрымку в'етнамскага народа, які змагаецца супраць агрэсіі ЗША!

Байкатуйце перавозкі салдат, зброі і матэрыялаў для інтэрвентаў і іх сатэлітаў!

Ператворым 20 ліпеня, гадавіну падпісання Жэнеўскіх пагадненняў, у міжнародны дзень салідарнасці з В'етнамам, дзень барацьбы за спыненне агрэсіі ЗША!

Гонар і слава гераічнаму в'етнамскаму народу, які самааддана змагаецца за незалежнасць і свабоду!

Вышэй сцяг міжнароднай салідарнасці!

Незалежнасць, свабоду і мір В'етнаму!

Справядлівая справа в'етнамскага народа пераможа!

Масква. 10 чэрвеня 1969 г.

УПЭЎНЕНАСЦЬ

Савецкія людзі з упэўненасцю глядзяць у сваю будучыню. Яны набліжаюць гэтую камуністычную будучыню сваёй нястомнай самаадданай працай, сваімі велічнымі здзяйсненнямі. Гэтыя свае самыя запаветныя спадзяванні і імкненні савецкі народ звязвае з мірам ва ўсім свеце. А каб абараніць мір на планеце, трэба яшчэ актыўней умацоўваць і згуртоўваць сусветны фронт барацьбітоў супраць падпальшчыкаў новай вайны, супраць імперыялізму.

Вось чаму з такой вялікай цікавасцю і ўвагай сочаць савецкія людзі за работай міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый, якая праходзіць у гэтыя дні ў сталіцы нашай краіны.

Нарада праходзіць паспяхова, і гэта вельмі радуе ўсіх нас, радае нам упэўненасці ў яе бясспрэчным канчатковым поспеху. Пераважная большасць камуністычных і рабочых партый свету адзінадушна падтрымліваюць асноўныя дакументы, падрыхтаваныя на кансультатыўных сустрэчах, заяўляе аб сваёй рашучасці мацаваць адзінства камуністычнага, рабочага і нацыянальна-вызваленчага руху, адзінства ўсіх сіл, якія выступаюць супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю і сацыялізм.

Удзельнікі Нарады з вялікай пашанай і ўдзячнасцю гавораць пра першую краіну сацыялізма, пра Камуністычную партыю Савецкага Саюза, якая першай у гісторыі чалавецтва прывяла народы нашай краіны да перамогі сацыялізма, падкрэсліваюць, што і цяпер, калі ўтварылася магутная сусветная сацыялістычная садружнасць, Савецкі Саюз па-ранейшаму застаецца галоўным фарпостам сіл прагрэсу і сацыялізма, надзейнай апорай усяго працоўнага чалавецтва, усіх заняволеных і прыгнечаных.

Савецкія людзі разумеюць гэта. І яны натхнёна працуюць, каб наша Радзіма з кожным днём набывала новыя сілы, з кожным годам станавілася ўсё больш багатай і магутнай. Рабочы клас, калгаснае сялянства, працоўная інтэлігенцыя дамагаюцца ўсё новых і новых паказчыкаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, культуры і навукі, нястомна клапоцяцца аб абараназдольнасці нашай краіны, мацуюць сваю брацкую салідарнасць з краінамі сацыялістычнай садружнасці, з працоўнымі ўсяго свету.

Дастойны ўклад у справу ўмацавання сілы і магутнасці нашай Радзімы ўносяць савецкія пісьменнікі, работнікі культуры і мастацтва. Яны—надзейныя памочнікі партыі ў выхаванні нашага народа ў духу савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Разам з тым, знаёмячыся з матэрыяламі Нарады камуністычных і рабочых партый, міжволі думаеш аб тым, што перад савецкай творчай інтэлігенцыяй паўстаюць новыя, вялікія і пачэсныя задачы, у прыватнасці, перад савецкімі пісьменнікамі. Так, да гэтага часу мы надзвычай рэдка закранаем у сваіх творах такія важныя тэмы сучаснасці, як праблема згуртаванасці міжнародных прагрэсіўных сіл супраць імперыялізму, барацьбы прыгнечаных народаў супраць каланіялізму і неакаланіялізму, расавай дыскрымінацыі, сацыяльнай няроўнасці ў краінах капіталу і г. д.

Несумненна, што мы павінны смялей і актыўней брацца за такія тэмы, з правільных ідэйных пазіцый і з высокім мастацкім напалам вырашаць іх у сваіх творах. Гэта будзе наш лепшы ўклад у вялікую і адказную справу барацьбы ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва супраць змрочных сіл імперыялізму і вайны.

Аляксей КУЛАКОЎСКІ,
сакратар партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР.



Сёння ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода пачынаецца Рэспубліканскі конкурс маладых выканаўцаў савецкай песні. У ім прымуць удзел маладыя спевакі—пераможцы абласных, раённых і гарадскіх конкурсаў на лепшае выкананне сучаснай савецкай песні. Іх выступленне ў Мінску будзе суправаджаць эстрадны аркестр Беларускага радыё і телебачання. І таму ёсць аб чым пагутарыць кіраўніку аркестра Б. Райскаму з удзельнікамі конкурсу Г. Варабей (Магілёў), І. Якаўлевым (Віцебск), Р. Жонавай (Полацк), Л. Петуховай (Вабруйск), Л. Корсак (Магілёў).

Фота А. КАЛЯДЫ.

ЗАЯВА МІЖНАРОДНАЙ НАРАДЫ КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ

Два гады назад Ізраіль учыніў адкрытую агрэсію супраць ААР, Іарданіі і Сірыі. З таго часу правячыя колы Ізраіля, якія падтрымліваюцца імперыялізмам, і перш за ўсё амерыканскім імперыялізмам, сусветнай рэакцыяй і сіяністкімі коламі, працягваюць акупіраваць арабскія тэрыторыі, захопленыя ў выніку агрэсіі, адмаўляюцца выконваць рашэнні ААН, у тым ліку Савета Бяспекі, праводзяць палітыку экспансіі і анексіі, учыняюць рэпрэсіўныя акты супраць арабскага насельніцтва ў занятых раёнах, няспынна ажыццяўляюць новыя ваенныя правакацыі.

Міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый рашуча асуджае агрэсію Ізраіля, што працягваецца і з'яўляецца грубым парушэннем нацыянальных правоў арабскіх народаў, уключаючы законныя правы арабскага народа Палестыны, грубым парушэннем Статута ААН, які асуджае агрэсію.

У сваёй справядлівай барацьбе супраць агрэсіі арабскія народы карыстаюцца эфектыўнай падтрымкай сацыялістычных краін, і ў першую чаргу Савецкага Саюза. У гэтай барацьбе іх падтрымліваюць сусветны камуністычны рух, сілы нацыянальнага вызвалення і ўсё больш шырокія колы грамадскай думкі ў капіталістычных краінах.

Нарада камуністычных і рабочых партый лічыць, што толькі пры ўмове вываду ізраільскіх войск з усіх акупіраваных арабскіх тэрыторый, поўнага ажыццяўлення рэзалюцыі Савета Бяспекі ад 22 лістапада 1967 г. могуць быць устаноўлены мір і спакой у гэтым раёне.

Нарада заклікае ўсе прагрэсіўныя сілы ўсяго свету ўзмацніць сваю дзейсную падтрымку арабскіх народаў і сваю салідарнасць з іх справядлівай барацьбой.

Масква. 7 чэрвеня 1969 года.

ТВОРЧАЯ ТРЫБУНА

МАНАЛОГ ПА-ЗА РАМПАЙ

Сямён КАЗІМІРОЎСКІ,
галоўны рэжысёр тэатра імя Якуба Коласа

ТРЭБА шчыра сказаць — тэатры ніколі не адчувалі недахопу ў песнях. Усім даволі добра знаёма фігура энергічнага закуліснага словаблуда, які звычайна не перагружаны рэпетыцыямі і спектаклямі, і з'едліва і тонка чэрніць усё вакол. Часам дзіву даешся, як такому «прыхільніку сапраўднага мастацтва» не надакучае гэты сумны занятак на працягу дзесяцігоддзяў.

З імі хочацца спрачацца!

У кожным тэатры ствараюцца новыя цікавыя спектаклі, усё больш актыўнай і вострай становіцца рэжысёрская думка, куды ярчэй і вобразней сталі працаваць тэатральныя мастакі, і зусім ужо не збяднела сцэна таленавітымі і здольнымі акцёрамі. Нам, рэжысёрам, рэдка ўдаецца адарвацца ад спраў у сваім тэатры, але толькі за апошні час я прагледзеў «На дне» і «Што той салдат, што гэты» на купалаўскай сцэне, бачыў выдатны спектакль гамяльчан «Пасля пакарання смерцю прашу...», і захапляўся цудоўным акцёрскім дуэтам на спектаклі «Варшаўская мелодыя» ў Рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага... Я ўпэўнены, што кожны тэатр нашай рэспублікі мае законную падставу ганарыцца радам старых і новых значных спектакляў у сваім рэпертуары. Таму ўсе трывогі нашы, увесь наш роздум і клопаты нічога агульнага не маюць з хранічным бурчаннем прысяжных тэатральных скептыкаў.

Мне не дае спакою адно пытанне — чаму нам, галоўным рэжысёрам, амаль заўсёды ўдаецца сёе-тое зрабіць у межах спектакля і так рэдка ў межах тэатра ў цэлым. Чаму так многа маіх калег, «бліснуўшы» асобнымі пастаноўкамі на працягу двух-трох гадоў, шукаюць сабе іншы тэатр, спадзеючыся ў іншым месцы набыць, нарэшце, калектыў творчых аднадумцаў. Бясспрэчна, не заўсёды якасці рэжысёра-пастаноўшчыка спалучаюцца з якасцямі арганізатара і выхавацеля складанага тэатральнага калектыву. Але ж трэба раз і назаўсёды зразумець, што рэжысёрам чалавек можа праявіць сябе адразу, у першых жа сваіх спектаклях, а галоўным рэжысёрам, толькі паступова, бо вынікі педагагічных і арганізацыйна-выхаваўчых намаганняў выспяваюць доўга. Але вельмі часта адносіны паміж галоўным рэжысёрам і значнай часткай калектыву «акісляюцца» вельмі хутка, і добрыя намеры чарговага галоўнага рэжысёра павісаюць у паветры. Да гэтага прывыклі. Мастацкія кіраўнікі прыходзяць і адыходзяць, а мы застаемся, — жартуюць акцёры.

Добра напісаў Мікалай Паўлавіч Акімаў у артыкуле «Аб рэжысёрскай смеласці»:

«На працягу многіх гадоў, калі крытыкаваўся кіраўнік, дык заўсёды дадавалася, што «калектыў у нас здаровы». Да гэтага ўсе так прывыклі, што ні ў каго і думкі не ўзнікала: як жа гэта так атрымліваецца, што нават у самым дрэнным тэатры пры любых дэфіцытах і сварках калектыў усё-такі здаровы?

Да чаго ж у такім выпадку прыйшоў гэты «здаровы калектыў»? На жаль, да зусім невырашальнай праблемы: як змяніць усё, нічога не змяняючы? Як стварацъ свежыя, таленавітыя, цікавыя спектаклі, не пакрыўдзіўшы ні аднаго члена трупы? Як запаліць сэрцы гледачоў, не перапяняючы ўласнай дрымоты?

На жаль, навука не ведае адказу на гэтыя пытанні. Нават такая салідная навука, як тэатразнаўства». (Кніга «Не толькі аб тэатры»).

Творчая ўдача тэатра не заўсёды становіцца прадметам усеагульнай радасці, а заканамерная ў мастацтве няўдача — прадметам усеагульнага засмучэння і карысным урокам для ўсяго калектыву.

Адным словам, я глыбока перакананы, што творчая атмасфера ў тэатры залежыць часам не толькі ад аб'ектыўных фактараў — рэпертуарных цяжкасцей, узроўню рэжысуры, таленавітасці творчага складу, — а і ад іншых фактараў, звязаных з эстэтычным і этычным узроўнем кожнага члена калектыву. Не, не ідэйныя супярэчнасці, не барацьба стыляў і манер, а ігра самалюбства, пытанні амбіцыі, атрута плётак і абгавораў раз'ядаюць часам тэатральную трупу і пазбаўляюць яе радасці.

Шлях адзін — павышэнне асабістай адказнасці кожнага за чысціню творчай атмасферы. І ад гэтай адказнасці не павінны пазбаўляць ні становішча, ні ганаровыя званні, ні ранней-

(Заканчэнне на 2-й стар.)

УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

ЯК ХЛЕБ НАДЗЁННЫ...

Мы прывыклі да кніг, да бібліятэк. Для нас зайсці ў бібліятэку — даволі звычайная і прывычная справа.

А вось што адчувае хлапчук, калі заходзіць у бібліятэку ўпершыню? Перад ім нецярплівая чарга такіх жа, як і ён. За бар'ерчыкам засяроджаны бібліятэкар, а далей паліцы. І кнігі, кнігі... Чалавечку, які толькі і паспеў адолець за сваё жыццё буквар ды «Муху-Цакатуху», яны здаюцца таямнічай і нават трохі страшнаватай гарой. Першакласнік запаўняе фармуляр і нясмела падступае да паліц. Выцягвае адну кнігу, другую...

Што ж узяў гэты новы чытач?

Ну, вядома, пачаў з казак. Цяпер многа новых зборнікаў, добры выбар. А можа Чукоўскага. Праз паўгода-год пачне захапляцца прыгодамі. Наслухаўшыся ад некага, будзе прасіць у бібліятэкара: «Мне пра шпіёнаў...» «Пра шпіёнаў» некаторыя пачынаюць чытаць падлеткамі і чытаюць усё жыццё. Памятаю, у час маёй работы ў газеце «Знамя юности» там друкавалася адна прыгодніцкая аповесць. А потым пачалі прыходзіць пісьмы ад чытачоў. Некаторыя з іх, пераважна пенсіянеры, прасілі «за плату» выслаць ім нумары газеты, дзе друкавалася аповесць, каб збіраваць, і пыталі, калі твор выйдзе асобным выданнем. Аказалася — гэтыя людзі вышэй за ўсё ставяць такую літаратуру і склалі з яе цэлыя хатнія бібліятэкі.

У наш век пачынаюць чытаць рана. Век інфармацыі. Цяпер ужо рэдка якая маці скардзіцца на тое, што яе сын ці дачка цураюцца кнігі. Хутчэй пануе іншае — з-за кніг сын перастаў вучыцца як след, не памагае па гаспадарцы... І ўсё ж бібліятэкары гавораць: каб стаць чытачом, патрэбен талент. Бібліяфагі — гэта яшчэ не чытачы.

Сапраўдны чытач пачынаецца толькі ў бібліятэцы, менавіта тут развіваецца яго талент. Зразумела, калі побач з навічком будзе вопытны праваднік...

Не кожнага возьме хлапчук у праваднікі, не кожнаму паверыць. Тым больш, калі яму штонебудзь навязваюць. У школе, калі настаўнік скажа — пачытай вось гэта, ён хутчэй за ўсё не адмовіцца, таму што гэта будзе мець уплыў на адзнаку, на табель паспяховасці. Але вось прыходзіць гэты хлапчук у дзіцячую бібліятэку і просіць прыгодніцкую кніжку. І бібліятэкар з самымі добрымі намерамі адказвае, што лепш бы яму пачытаць што-небудзь па геаграфіі ці гісторыі. І можа здарыцца, што ён, чытач, які марыў тут знайсці кнігу «для душы», паспяшаецца да выхаду. У наступны раз сына прывядзе ўжо бацька ці маці, і будуць яны скардзіцца, што ў другіх дзеці як дзеці, а гэты толькі і ведае, што лётаць пасля ўрокаў па двары, ганяць мяч. І хлапчуку пад бацькоўскім строгім позіркам зноў уручаць кніжку «па геаграфіі». І, магчыма, пад тым жа бацькоўскім прымусам, ён і прачытае яе і нават перакажа потым змест. Але тая адмоўная думка аб бібліятэцы,—«ат, тое, што і ў школе»—ужо надоўга засядзе ў галаве.

Гэта не тэаратычныя разважанні, а практыка. Пагартайце асабістыя дзённікі работнікаў цэнтральнай Мінскай бібліятэкі імя Мікалая Астроўскага і ў іх прызванне — геалогія. Але ёсць і такія, што ўжо ў пятымшостым класе цвёрда вырашылі, кім яны стануць, калі вырастуць. І гэту іх рашучасць падграваюць бацькі, яны і думаць не хочуць, каб дзіця чытала што-небудзь іншае. На школьныя прадметы таксама глядзяць так: гэты вось спатрэбіцца, а гэты лішні, на яго і час не варта марнаваць.

Іншы раз такія хібы ў выхаванні настаўніку цяжка заўважыць. А бібліятэчнаму работніку адразу кідаецца ў вочы — выдае тое, што чытаюць. І калі сямікласніца Оля Галышкіна ўпарта, кнігу за кнігай чытала толькі аб медыцыне, бібліятэкару Валянціне Уладзіміраўне Гаўрыленка не цяжка было здагадацца, чаму. А калі пагутарыла з дзяўчынкай, дыягназ пацвердзіўся. Так, яшчэ ў чацвёртым класе Оля вырашыла, што будзе ўрачом. І некалькі гадоў упарта, як ёй здавалася, рыхтавала сябе да гэтай прафесіі. Дзяўчынку нялёгка было пераканаць, што і медыцынскаму работніку патрэбны рознабаковыя веды аб жыцці, спатрэбілася нямала і часу, і педагагічнага таленту. Так, так, педагагічнага таленту, без яго проста немагчыма стаць добрым работнікам дзіцячай бібліятэкі.

Хлапчукі мараць стаць дужымі. Гэтыя хлапчукі мараць аб прафесіі... спартсмена. Але добрае само па сабе імкненне да дасканалага фізічнага развіцця не можа не насцярожыць. Так узнікае тэма чарговай гутаркі з чытачом: як стаць не толькі моцным, але і ўсебакова адукаваным, культурным чалавекам. Мала, чытаючы кнігі «пра спартыўную барацьбу», навучыцца нейкім хітрым барцоўскім прыёмам, займець перавагу над аднагодкамі. Па-сапраўднаму моцны той, хто моцны духам. Адсюль і тэмы гутарак аб гераізме, аб адказнасці перад Радзімай і людзьмі.

І, глядзіш, хлапчук нясе ўжо з сабою кніжку аб гераічнай барацьбе беларускіх партызанаў у гады Айчыннай вайны, аб подзвігах партызан у тыле ворага, аб смеласці і знаходлівасці нашых разведчыкаў.

Неяк у Мінскім парку імя Горкага работнікі Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі горада арганізавалі для шасікласнікаў раніцнік «Піянер, камсамолец, камуніст». Гэта была шчырая размова аб сапраўдных людзях, аб высакароднай мужнасці. На раніцнік запрасілі П. Сталярова, які быў ад'ютантам В. Блюхера, і ўдзельніка першага Усерасійскага камуністычнага суботніка В. Валуева. Яны выступілі з цікавымі ўспамінамі. І ўжо на другі дзень дванаццаць хлапчукоў і дзяўчынак прыйшлі ў бібліятэку. Яны папрасілі даць ім кнігі пра ветэранаў партыі.

Раніцнікі, «клуб вясёлых і начытаных», кніжныя выстаўкі, віктарыны, чытанні лепшых твораў Ленініяны, бібліяграфічныя агляды навінак, індывідуальныя гутаркі... Іх многа, форм і метадаў, пры дапамозе якіх работнікі бібліятэкі імкнуцца выхаваць у падлеткаў высокую культуру чытання, а разам з тым — імкненне ўзяць з кнігі ўсё лепшае, вартае пераймання.

Ёсць канкрэтныя лічбы, па якіх можна меркаваць аб работце бібліятэкі. Летась, напрыклад, выдана трынаццаць з лішнім тысяч экземпляраў грамадска-палітычнай літаратуры, — амаль у паўтара раза больш за папярэдні. А зараз попыт на гэтую літаратуру намнога ўзрос. Вельмі шмат бяруць кніг пра Леніна.

І ўжо зусім не ўкладзеш ні ў якія лічбы, колькі хлопчыкаў і дзяўчынак, дзякуючы правільнаму чытанню, духоўна ўзбагаціліся, адчулі сябе грамадзянамі сваёй Радзімы, барацьбітамі за лепшае, камуністычнае. З такімі чытачамі пісьменнікам можна ўжо размаўляць на роўных, не падладкоўваючыся і не спрашчаючы сутнасць рэчаў.

Я зноў вярнуся да выслоўя бібліятэкараў: каб зразумець талент пісьменніка, трэба мець талент чытача. Папрасіце ў юных аматараў кнігі іх сшыткі, куды яны запісваюць думкі аб прачытаным. Часам запісы кароткія, часам разважанняў аж залішне. Але ўбачыш, што думкі сапраўды ёсць: свежыя, невычытаныя — плён роздуму юных грамадзян.

Зусім кароткая нататка з'явілася ў сшытку Жэні Мароз пасля чытання кнігі В. Д. Ульянава «У Горках»: «Трэба заўсёды таварыць праўду...» Гэта запісала тая самая Жэня, якая, па словах маці, «надта многа выдумляла».

Калі падлеткі заканчваюць восьмы клас, прыходзіць час развітвацца з дзіцячай бібліятэкай. І вось апошняя гутарка з работнікам бібліятэкі. Высвятляецца, што здолеў узяць за гэтыя гады чытач, чым дапамог яму бібліятэкар. Вынікі такіх штогадовых імправізаваных «экзаменаў» абмяркоўваюцца потым на пасяджэнні савета бібліятэкі, на канферэнцыях бацькоў.

Прыемна бібліятэкару бачыць, што кніга стала для падлетка хлебам надзённым. І з якой горыччу даводзіцца часам адзначаць свае няўдачы! Так здараецца тады, калі залішне паспадзяваўшыся на сілу масавых мерапрыемстваў і бясспрэчную доказнасць плакатаў, бібліятэкар раптам бачыць — «праглядзелі».

А вось якія турботы ў загадчыка бібліятэкі Х. Гаранка.

— Я працую ўжо тут са снежня сорак шостага года. Але, вы думаеце, мне ад гэтага лягчэй, чым іншым работнікам? Кожнае пакаленне юных чытачоў патрабуе новага да сябе падыходу. Старым багажом не пражывеш. Цяпер вельмі ўзрос попыт на дзіцячую публіцыстыку. А такіх кніг вельмі мала. Зараз у нас ёсць больш за 3 тысячы рублёў на набыццё навінак. Абы чаго набіраць не хочаш, а тое, што лічыш патрэбным, абласны бібкалектар дае па экземпляру — па два. Так бывае з кніжкамі Дубоўкі, Шамякіна, Пановай, Гарэцкага. А нам трэба хаця б па дзесяць экземпляраў. Вось і звонім у кнігарні, бегаем. І дарэмна толькі час трацім.

Загадчык бібліятэкі зноў цягнецца да тэлефона, — звоніць у кнігарню: ёсць тры тысячы рублёў, дайце кнігі!

...У чытальнай зале над кнігамі схіліліся дзеці. Яны адкрываюць для сябе неабсяжны і складаны свет...

А ля бар'ерчыка бібліятэкара чарговы навічок. Якой цікаўнасцю гараць яго вочы. Позірк яго спыняецца на кніжнай выстаўцы, на плакатах побач з ёю: «Як жыць, каб твае справы засталіся ў памяці людзей?», «Жыццё для сябе, ці для людзей?»... А далей кніжныя паліцы, цэлы Манблан для навічка. І бібліятэкар узнімаецца насустрач, каб паказаць дарогу на вяршыню...

Э. ЯЛУГІН.

15 год працуе кінамеханікам у Магілеўскім кінатэатры «Нырвоная зорка» Валянціна Акімаўна Бекер. Валянціна Акімаўна добра ведае сваю справу, з месяца ў месяц выконвае план.

Фота В. ДУБІНКІ.

ДРУЖБЕ КУЛЬТУР ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Гомельскі дзяржаўны універсітэт, самы малады ў нашай краіне, правёў першы навуковы сімпозіум — міжрэспубліканскую канферэнцыю па вывучэнні беларуска-ўкраінскіх літаратурных і фальклорных сувязей. У канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя Беларусі, Украіны і Расійскай Федэрацыі.

Пленарнае пасяджэнне адкрыў доктар філалагічных навук прафесар ГДУ П. Ахрыменка, загадчык кафедры, якая выступіла ініцыятарам і арганізатарам гэтага важнага навуковага мерапрыемства. На беларускай, рускай і ўкраінскай мовах гучалі прывітанні, з якімі звярнуліся да прысутных інструктар Гомельскага абкома КПБ А. Кавалёў, рэктар ГДУ Ул. Белы, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага АН СССР Б. Кірдан, дацэнт Львоўскага універсітэта Ф. Небарачок, прафесар Чарнавіцкага універсітэта В. Лесін, загадчык сектара ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР А. Мальдзіс, украінскі паэт А. Юшчанка, беларускія пісьменнікі І. Шамякін, М. Аўрамчык, М. Кусянкоў.

Стан і задачы вывучэння беларуска-ўкраінскіх літаратурных і фальклорных сувязей ахарактарызаваў у сваім дакладзе прафесар П. Ахрыменка.

Аналіз украінскіх, рускіх і беларускіх песень аб провадах брата (казака, воіна) даў падставу доктару філалагічных навук Б. Кірдану гаварыць аб тыпалагічным падабенстве і ўзаемасувязях фальклорных твораў усходніх славян. Супрацоўніца Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР Э. Мартынава прааналізавала ў сваім дакладзе водгукі ўкраінскага друку пачатку XX стагоддзя на нараджэнне маладой беларускай літаратуры, а дацэнт Чарнігаўскага універсітэта В. Піўтарадні на матэрыяле ўкраінскай перыёдыкі пабудаваў сваё паведамленне «Сяргей Палуян пра беларускі тэатр». Аб ролі Украіны ў беларуска-чэшскіх культурных сувязях гаварыў супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР А. Мажэйка. Цікавую тэму «Уплыў Васіля Стэфаніка на Змітрака Бядулю» даследаваў прафесар В. Лесін. Украінскі перыяд з жыцця Яна Баршчэўскага і Янкі Журбы асвятліў кандыдат філалагічных навук А. Мальдзіс і літаратуразнаўца з Палтавы П. Ратач.

Кандыдат філалагічных навук І. Маторны паведаміў аб традыцыях і сучасным стане беларусістыкі ў Львове. Аспірант кафедры гісторыі БССР Мінскага педагагічнага інстытута І. Саракавік расказаў аб культурна-літаратурных сувязях Беларусі і Украіны ў 1921—1932 гадах. Тэме «Беларусь у творчасці Максіма Рыльскага» прысвяціў свой даклад кандыдат філалагічных навук Ф. Небарачок, а настаўнік з Бабруйска Ц. Лівкумовіч разгледзеў мастацкія асаблівасці перакладаў Андрэя Малышкі з лірыкі Янкі Купалы. Дацэнт Львоўскага універсітэта І. Дзенісюк прачытаў даклад «Праблемы навелы ва ўсходнеславянскіх літаратурах». Цікавасць прысутных выклікала паведамленне дацэнта Кіеўскага універсітэта В. Капцілава аб тым, што ў сталіцы братняй рэспублікі пачынаецца праца па падрыхтоўцы выдання збору твораў Янкі Купалы на ўкраінскай мове і беларуска-ўкраінскага слоўніка.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі адзінадушнае рашэнне праводзіць такія канферэнцыі аб сувязях культур і моў Беларусі і Украіны сістэматычна. Наступная канферэнцыя адбудзецца ў 1971 годзе ў Львове.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем народны артыст Беларускай ССР, акцёр Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Сяргейчык Цімафей Мікалаевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЛЕТА

СЯБРОЎСТВА ЎМАЦОЎВАЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Дваццаць разоў ужо адкрывалася заслона ў дзвюх тэатральных залах Мінска, дзе паказвае спектаклі славутая трупа Акімава.

Мінчане бачылі, як своеасабліва трактуюць акімаўцы жыццёвыя тыпы сённяшняга дня. Успомнім «Званок у пустую кватэру», «Нічога не здарылася», «Пяты стрэл». У адным выпадку гэта гарэзліва сыграны фельетон; у наступны вечар вы сочыце за тым, як з добрай усмешкай раскрываецца лірыка светлых пачуццяў маладога чалавека; на трэці раз акцёры ствараюць камедыйнае відовішча з усімі атрыбутамі гратэска... Калі ж на сцэне п'есы Эдуарда дэ Філіпа, мы нібы трапляем у Італію, дзе сонца (сонца акімаўскага зазяння!) бязлітасна агаляе трагедыйную рэчаіснасць, варожую ідэалам і наіўным ілюзіям дасціпных і вясёлых неапалітанцаў і рымлян дваццатага стагоддзя («Цыліндр» і «Мастацтва камедыі»). Арыгінальнай мандрамай, у якой праз сацыяльна завостраную іронію прабіваецца вялікая драма жаночага сэрца, асуджанага на адзіноту ў буржуазным свеце, гучаць «Сілуэты Парыжа» з Аленай Юнгер у трох галоўных ролях гэтага трыпціха...

Зразумела, тэатр успрымае ацэнку сваёй работы па тым, як сустракае спектаклі глядач,— цішыня, смех, апладысменты... Эмацыянальны настрой тых, хто сёння ў зале, перакласці на лагічную мову цяжкавата. Мы ўзялі «маланкавыя інтэрв'ю» ў трох мінчан.

— Канечне, Варапаеў — самае яркае ўражанне! — гаворыць дзяўчынка ў акулярах (Гэта Саша Максімцава, медыцынская сястра са шпіталю інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны). — Яго Дуброўскі ў спектаклі «Званок у пустую кватэру» падкупляе настроеным на іранічны лад розумам. Быццам чалавек хавае сваю ўражлівую душу пад маскай жартаўніка і нават прайдзісвета... А потым ён жа — Дон Жуан. Бліскучы, вытрыманы і да таго ж яшчэ трошкі стомлены ад сваіх дзівосных прыгод, гэты герой здзіўляе заўсёднай гатоўнасцю падначаліць сабе людзей і падзеі. Праўда, слухаць вершы Байрана тры гадзіны, і сачыць адначасова за маляўнічым відовішчам я не прывыкла, бо раней нічога такога не бачыла. Таму адчуваю сябе неяк разгублена і не паспела яшчэ падумаць, як спектакль адпавядае маім чытацкім уражанням ад паэмы... Мусіць, трэба цяпер яе зноў перачытаць.

— Вы звярнулі ўвагу на тое, як слухала «Фізікаў» зала? — пытаннем на пытанне адказвае кандыдат геалагічных навук Святлана Рыгораўна Драмашка. — Спектакль прымушае думаць, хоць я і смялася з Ньютана, з Эйнштэйна і асабліва з пані Мацільды фон Цанд, і гэта вялікая заслуга артыстаў Лемке, Беніямінава і Уваравай. А ў тэатры пастаўлены і сыграны «Фізікі», я сказала б, з ювелірнай мастацкай дакладнасцю. Якая цудоўная Уварава! Жэсты і міміка яе такія артыстычна выразныя, што верыш і самым нечаканым паваротам у душы гэтай Мацільды фон Цанд...

— Культура маленькай ролі — катэгарычна заявіў пракурор абласной пракуратуры А. Івінскі. — Папулярнай Зарубінай даручана, зрэшты, другарадная роля ў «Званку ў пустую кватэру». Здаецца, толькі тройчы і выходзіць яна на сцэну, а глядзець і слухаць яе — сапраўдная эстэтычная асалода. А вы звярнулі ўвагу на Захарава? У «Фізіках» у яго некалькі рэплік — а гэта ж закончаны характар! Ці зусім малады Шэйнін у «Званку...». Яны рухаюцца і гавораць, разумеючы сэнс «другога плана», які і мы павінны зразумець. І дасягаюць мэты — іх паводзіны на сцэне я ўспрымаю як вынік унутраных перажыванняў герояў нават тады, калі іграй артыстаў выглядае знешне стылізаванай «пад Акімава», Акімава-жывапісца і Акімава-рэжысёра...

Што ж, хай спрэчкі і абмеркаванні працягваюцца. Тэатр на тое і тэатр, каб абуджаць у гледачоў змястоўныя хваляванні і роздум аб жыцці, адлюстраваным у мастацтве з дапамогай музы палымянай сатыры, і аб творчасці цікавых і самабытных майстроў сцэны. І спектаклі акімаўцаў пакідаюць яркае ўражанне нават у тых, хто «трошкі стамляецца» на «Дон Жуане» або весяліцца на сучасным вадэвілі.

— Ваш горад чароўны, а мінчане ўжо сталі нашымі добрымі сябрамі! — сказала артыстка Ірына Пятроўна Зарубіна.

Гэта — не звычайна ветлівыя словы госця. Ленінградцы знаходзяць час для глыбокага знаёмства з новым для іх горадам, з яго новабудоўлямі і выдатнымі мясцінамі. Іх можна сустрэць у музеях і кнігарнях, на выстаўках і ў парках. На здымку, зроблены У. Кітасам, — група артыстаў тэатра камедыі ў музеі Янкі Купалы. Справа налева — народная артыстка РСФСР і Таджыкскай ССР І. Зарубіна, артыст В. Нікіценка, народная артыстка РСФСР А. Юнгер, артысты Г. Варапаеў і А. Прохарава ў адной з залаў музея.

В. ІВІН.

шыя заслугі. Кожны можа працаваць у такім тэатры, які ён носіць у сабе. Калі яму не цікава, сумна глядзець, як рэпеціруюць яго таварышы, калі, адпрацаваўшы свой «кавалак», ён імкнецца хутчэй пакінуць рэпетыцыйнае памяшканне для балбатні, калі ён абыякавы да лёсу таварыша па сцэне і можа атруціць яму настрой плёткай, калі ён паспешліва грыміруецца і выходзіць на сцэну без унутранага творчага агню, калі яму не хапае цярпення дачакацца фінальнай сцэны спектакля, каб праявіць высокую павагу да гледача і выйсці на паклон,—колькі б такі чалавек ні гаварыў, «правільных» прамоў, ён чужы ў калектыве, прычына многіх бед і засмучэнняў калектыву.

Гэта іменна і меў на ўвазе К. С. Станіслаўскі, калі пісаў: «Мы прыкрываем сваё самалюбства, зайздрасць, інтрыгі ўсемагчымымі прыгожымі словамі, але праз іх увесь час прасочваюцца атрутныя выпарэнні, якія атручваюць атмасферу тэатра». Яго засмучала, што ёсць людзі настолькі дурныя і безгустоўныя, «што лічаць за лепшае зносіць у адведзенае для творчасці і мастацтва месца ўсе жыццёвыя плёткі, зваднкі, інтрыгі. Яны не могуць адхаркаць усё агіднае там, за парогам тэатра, і прыходзяць пляваць у чыстае месца. Незразумела!»

Мастацтва тэатра надзвычай жорсткае ў сваёй дыферэнцыяцыі. Пры напружаным калектыўным характары творчасці адбываецца няўмольны працэс «прыватнага прысвяення лаўраў». Патрэбна высокая ідэйнасць, творчая бескарыслівасць, любоў да тэатра ў цэлым, каб зберагчы душу ад іржы.

Характэрна тое, што К. С. Станіслаўскі ніколі не працаваў на перыферыі, меў заўсёды справу з людзьмі найвышэйшага інтэлекту і душэўнай прыгажосці, аднак у яго літаратурнай спадчыне часта закранаюцца пытанні творчай этыкі. Іменна ў няўхільным захаванні высокіх этычных норм, ідэйным і маральным удасканаленні асобы мастака ён бачыў заруку росквіту савецкага тэатра будучыні.

АГУЛЬНАВДОМА: аблічча тэатра — гэта, у першую чаргу, рэпертуар. Ідэйна-грамадская значнасць, літаратурныя вартасці, разнастайнасць п'ес.

Давайце, напрыклад, паглядзім, якія спектаклі ўвайшлі ў рэпертуар тэатра імя Я. Коласа за апошнія два з лішнім гады. Нацыянальны рэпертуар папоўнілся спектаклем «Вайна пад стрэхамі» па кнізе А. Адамовіча і спектаклем «Высокі поўдзень», які складаецца з твораў сучаснай беларускай паэзіі. Тэатр іграе «Шостае ліпеня» М. Шатрова, «Клапа» У. Маякоўскага, «Варшаўскую мелодыю» Л. Зорына, «Сінюю варону» Р. Пагодзіна, «Захавай маю тайну» В. Сабко, «Званок у пустую кватэру» Д. Угрумава і «Усім смярцям назло» В. Цітова. З рускай класікі трывала ўвайшоў у рэпертуар спектакль «Зыкавы» М. Горкага, з сусветнай драматургіі «Дурнічка» Лопе дэ Вэга, «Слуга двух гаспадароў» Гальдоні і «Марыя Сцюарт» Шылера. Афіша, якой не варта саромецца! І ўсё ж ёсць у нас трывога — а ці ўсё мы зрабілі так, як трэба, ці задавальняем запатрабаванні часу? Тэатру яўна не хапае адной-двюх значных п'ес аб нашай сучаснай савецкай рэчаіснасці. Гэта і віна і бяда наша.

Як бы ні складаўся бягучы рэпертуар, ён не можа даць поўнага ўяўлення аб творчых магчымасцях тэатра, яго гісторыі, яго традыцыях. Нельга без болю глядзець, як разбураюцца і знікаюць з рэпертуару спектаклі, якія мы працягваем называць і пералічваць у парадных справаздачах, а сцэнічнае жыццё іх было такім нядоўгім. Асабліва гэта адносіцца да арыгінальнага нацыянальнага рэпертуару, стварэнне і захаванне якога з'яўляецца адной з першачарговых задач нацыянальных тэатраў.

Адзін характэрны прыклад. У мінулым сезоне мы аднавілі спектакль «Лявоніха» П. Данілава, які не ішоў ужо некалькі гадоў. І што ж? Каля двух дзесяткаў разоў ён прайшоў у гэтым сезоне, выклікаючы нязменную цікавасць гледачоў. З вялікім творчым уздымам іграюць у гэтым спектаклі такія вядучыя артысты, як Ц. Сяргейчык, М. Звездачотаў, З. Канапелька, Ф. Шмакаў, А. Шэлег, сапраўднага драматызму дасягаюць у сваіх ролях Л. Куцькіна, А. Мельдзюкова, А. Кацельнікаў. З добрай гарэзлівасцю ўся трупа праводзіць масавыя сцэны, напоўненыя фальклорнымі танцамі, прыпеўкамі, іскаркамі народнага гумару. Няхай выканаўцы сёе-тое страцілі ў параўнанні з прэм'ерай — спектакль дазваляе трымаць у цэнтры рэпертуару вялікую групу тых акцёраў розных пакаленняў, якім не заўсёды выпадаюць такія ж цэнтральныя ролі ў бягучым рэпертуары.

Але выпадак з «Лявоніхай» толькі падкрэслівае крыўдную акалічнасць — дачасную пагібель многіх значных спектакляў мінулых гадоў.

Па тэлебачанні давалася перадача «Беларуская драматургія на сцэне тэатра Я. Коласа». У ліку іншых быў паказаны вялікі ўрывак з «Раскіданага гнязда» Я. Купалы. І народны артыст рэспублікі Ц. Сяргейчык сыграў цэнтральную ролю з такім драматызмам, з такой артыстычнай свабодай, што я як бы зноў убачыў гэтага старэйшага артыста нашага тэатра ў росквіце творчых сіл. А прэм'ера ж гэтага спектакля адбылася ў 1951 годзе. Міжволі падумаеш, колькі школьнікаў, студэнтаў, рабочай моладзі, колькі калгасаў і райцэнтраў, колькі гастрольных гарадоў маглі б яшчэ захапляцца творчасцю Я. Купалы і любавацца сталым майстэрствам аднаго са старэйшых акцёраў нашага тэатра, калі б гэты класічны спектакль так лёгка не выпаў з рэпертуару тэатра. Жыве ж на сцэне тэатра «Несцерка» 25 гадоў! Змяніліся ўсе выканаўцы цэнтральных роляў, але клопаты аб захаванні спектакля сталі нянісаным законам тэатра. Шкада, што гэта — шчаслівае выключэнне.

Паспрабуем разабрацца ў прычынах дачаснай пагібелі значных спектакляў, мінулых гадоў.

За апошнія дзесяцігоддзе ў тэатры змянялася пяць галоўных рэжысёраў, не лічачы чарговых. Гэта — Шчарбакоў, Браганцаў, Папоў, Падабед і працуе цяпер аўтар гэтых радкоў. Прычым, кожны наступны галоўны рэжысёр ужо не заставаў у рэпертуары значных спектакляў сваіх нават бліжэйшых папярэднікаў. «Крыніцы» І. Шамякіна, «Навальніца будзе» па трылогіі Я. Коласа, «Дачніка» М. Горкага, «Кароль Лір» Шэкспіра — ім бы жыць ды жыць. Але тэатр пакінуў рэжысёр, спектаклі засталіся без нагляду.

Дэмаралізуе акцёраў і перыяд «міжцарствА» — пакідаюць трупу патрэбныя акцёры, якія «бягуць» за рэжысёрам, якога яны палюбілі, і г. д. і да т. п. Такім чынам, ад'язджае галоўны рэжысёр і разам з чамаданамі вязе свае «этапныя» работы, якія потым упамінаюцца толькі ў якасці жывога дакору менш удаламу пераемніку.

Частая і часам неапраўданая змена кіраўніцтва — гэта толькі адна з прычын. Ёсць прычыны больш празаічныя. Захаванне строгага рэпертуару — гэта часам «дарагая» раскоша ва ўмовах невялікага абласнога горада. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Тры гады назад, у дні свайго 40-годдзя, тэатр Я. Коласа — у каторы раз! — застаўся без мастацкага кіраўніцтва. Да гонару калектыву трэба сказаць, што ён здолеў аб'яднаць свае намаганні, праявіў сапраўдны дух калектывізму і творчай самаадданасці і падрыхтаваў да юбілейнай даты п'есу «Бацькаўшчына» К. Чорнага. Спектакль вельмі ўзняў тэатр у грамадскай думцы, вызначыў змест юбілейных урачыстасцей, і выклікаў шматлікія станоўчыя водгукі друку. Але спектакль прайшоў усяго 15 разоў. Гэта ўжо і мая віна—трэба было падтрымаць, захаваць «Бацькаўшчыну» на афішы. Прыкладна гэтак жа склаўся лёс спектакля «Вайна пад стрэхамі». Спектаклі гэтыя куды вышэйшыя па сваім мастацкім узроўні за такія, як «Шчыт і меч» або «Захавай маю тайну», якія так доўга цешылі сэрца адміністрацыі тэатра сваёй высокай рэнтабельнасцю. Так, касавыя меркаванні часам бяруць верх, і мы самі ідзём на кампрамісы. А потым нас жа дакарае наша сумленне.

Сімфанічная музыка не траціць сваёй эстэтычнай каштоўнасці ад таго, што яна прыцягвае менш слухачоў, чым іншы папулярны эстрадны аркестр. Але, на жаль, усе паказчыкі, па якіх ацэньваецца дзейнасць тэатра і ад якіх залежыць не толькі лёс прэмій, але і рэальная магчымасць павысіць аклад або катэгорыю артыстам, — гэта ў асноўным паказчыкі касавыя. У такіх умовах ад дырэкцыі патрабуецца многа сіл, каб пераадолець глухое супраціўленне славутага «інстытута ўпаўнаважаных па арганізацыі гледача», якія, ой, як не любяць «прадаваць» спектаклі, што не вызначаюцца прымітыўнай прыбытковасцю і касавай прывабнасцю. Я думаю, што супярэчнасць паміж мастацкімі якасцямі і касавым поспехам спектаклю дае сябе адчуваць не толькі на перыферыі. Інакш, чым растлумачыць, напрыклад, знікненне з афішы тэатра Я. Купалы спектакля «На дне», аднаго з найбольш значных спектакляў тэатра за апошні год! Відаць, інерцыю «касавасці» нялёгка пераадолець нават у сталіцы, у горадзе з амаль мільённым насельніцтвам.

Відавочна адно, што праблема захавання рэпертуару, асабліва арыгінальнага нацыянальнага рэпертуару, чакае сваёго вырашэння. Думаецца, што Упраўленне па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР павінна распрацаваць рад заахвочвальных мер, якія б стваралі ўмовы для зацікаўленасці тэатраў у захаванні арыгінальнага нацыянальнага рэпертуару, у яго сістэматычным абнаўленні і аднаўленні. Неабходна, каб тых гледачоў, якія прыходзяць на спектакль «Бацькаўшчына», адміністрацыя паважала не менш, чым тых, якія аддаюць перавагу «Маёй тайне»!

Ёсць яшчэ адзін рэальны шлях захавання нацыянальнага рэпертуару. Гэта прынцыпова іншая практыка правядзення гастроляў. Гастролі нацыянальнага тэатра за межамі сваёй рэспублікі павінны праводзіцца як творчая справаздача, як вялікая падзея культурнага абмену, як свята дружбы і сувязі паміж народамі. На справе гэта бывае далёка не так.

Пазаўлетась у Калінінградзе мясцовыя арганізатары вельмі ўгаворвалі нас іграць на рускай мове. Па гэтай прычыне мы нават крыху скарацілі тэрмін сваіх гастроляў у гэтым горадзе. Балазе, матэрыяльныя справы тэатра дазволілі нам зрабіць гэты горды жэст. Летась дырэкцыя Палтаўскага тэатра запрасіла нас на гарантыйныя гастролі, але пры заключэнні дагавору выключыла з афішы «Бацькаўшчыну» і «Вайну пад стрэхамі» па чыста камерцыйных меркаваннях.

У рэспубліцы тры нацыянальныя драматычныя тэатры. Неабходна, каб стварэнне і захаванне арыгінальнага нацыянальнага рэпертуару стала адным з асноўных паказчыкаў іх творчай дзейнасці.

МАНАЛОГ ПА-ЗА РАМПАЙ

ВЯРНУСЯ яшчэ раз да акцёрскіх праблем.

Мы часта гаворым словы «малады артыст» або «маладая актрыса» так, быццам маладосць з'яўляецца іх вялікай асабістай заслугай. Між тым, варта б памятаць, што ў словазлучэнні малады артыст галоўным з'яўляецца слова «артыст»—тады многае стане на сваё месца. Абаянне маладосці на сцэне толькі тады прывабнае, калі яно памножана на сілу таленту, вялікую працавітасць і высокі прафесіяналізм.

У нас, у тэатры дзве трэці трупы—моладзь. Многія з іх ужо даўно стаяць у цэнтры рэпертуару і адкрыта сумуюць, калі ім доўга не трапляецца цэнтральная роля. Праўда, лёгкі доступ да адказных роляў нярэдка забівае ў пачынаючых артыстаў трапяткое стаўленне да бясслоўнага выхаду, да ролі «без нітачкі», да ўдзелу ў народнай сцэне або да стварэння патрэбнага «шуму» за кулісамі. Даводзіцца часам са смуткам назіраць, як добрасумленна і артыстычна паводзяць сябе ў масавых сцэнах «Несцеркі» ветэраны тэатра, часам заслужаныя і народныя артысты рэспублікі, і як дзяжурна «сваволяць» на сцэне маладыя адукаваныя артысты, не праяўляючы ні густу, ні пачуцця стылю, ні беражлівага стаўлення да спектакля. І наогул — ці не вельмі доўга мы ўжываем да артыстаў жыццерадасны эпітэт «малады»? І ці не пераацэньваем мы наогул значэнне метрыкі ў творчай асобе акцёра? Колькі перад намі прыкладаў неўвядальнай сцэнічнай маладосці і дачаснага змарнення безадносна да ўзросту? І ці не садзейнічаем мы накапленню баласту ў тэатрах шчодрым і памяркоўным ужываннем эпітэта «малады» да артыстаў, які не здолеў да трыццаці гадоў набыць належную прафесіянальную форму? Прынята лічыць, што вылучэнне на конкурс і ўсялякія іншыя формы абнаўлення трупы павінны датычыць людзей сярэдняга і пажылога ўзросту. Гэта памылка.

Найбольш актыўным, на маю думку, павінен быць дух спаборніцтва і «натуральны адбор» да трыццацігадовага ўзросту. Тады ў сярэдні пажылы ўзрост не прасочыцца такая колькасць пасрэдных і малаперспектыўных акцёраў і актрыс. Я ўпэўнены, што большасць акцёраў, з якімі б тэатры з задавальненнем рассталіся, гэта ахвяры залішняй паблажлівасці да іх і ў пачатку іх творчага шляху. Што датычыць агульнага ўзроўню прафесіянальнай падрыхтоўкі артыстаў у сценах Беларускага інстытута, дык вопыт нашага тэатра сведчыць, што найбольш слабым звяном з'яўляецца гаворка. На жаль, у большасці выпускнікоў не пастаўлены голас, вялая дыкцыя і слабая моўная тэхніка. Не гаворачы ўжо аб тым, што мы адчуваем дадатковыя цяжкасці, звязаныя з тым, што рад вядучых нашых акцёраў з ліку моладзі валодаюць беларускай мовай далёка не артыстычна. Маладыя акцёры часам самі адчуваюць, што неарганічнасць вымаўлення нараджае і неарганічнасць сцэнічнага жыцця, абкрадвае іх духоўна. Канечне, тут многае залежыць ад саміх акцёраў, але відавочна і тое, што ў інстытуце выкладанне сцэнічнай мовы наогул і беларускай мовы, у прыватнасці, вядзецца не лепшым чынам.

Моладзь

СЯРОД КНІГ

У СВЯТЛЕ ФАЛЬКЛОРУ

Ёсць праблемы, у святле якіх па-новаму можа глядзецца ўся гісторыя нашай літаратуры. Прыгадаем, што адна з такіх праблем, якая памагла паяднаць у адзін непарыўны працэс многія літаратурныя з'явы і факты, была, напрыклад, праблема рэалізму, якую з добрым плёнам распрацоўвалі В. Барысенка, М. Ларчанка, В. Іванышын і інш.

Кніга Міколы Грынчыка «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» як бы працягвае гэтую шырока распачатую размову аб шляхах станаўлення і развіцця нашай літаратуры. Прычым, гэтыя шляхі даследчык асвятляе з нечаканага, маларазведанага боку — з боку фальклорных традыцый, якія асабліва паспрыялі самабытнаму развіццю нашай паэзіі.

Ужо з першага раздзела працы аўтар вядзе нас да шматлікіх фальклорных вытокаў беларускай паэзіі, паказвае, як мастацкае мысленне народа прарывалася праз усталяваныя нормы «эпіграм» і вершаў Андрэя Рымшы і Яна Пашкевіча, як народная фразеалогія паступова выцясняла старажытнаславянскія штампы, ажыўляючы вострым досціпам многія творы старажытнай пісьменнасці («Допіс» Кміты-Чарнабыльскага, напрыклад).

Заўважу мімаходзь, што, гаворачы аб вытоках фалькларызму, аўтару не шкодзіла б у святле праблемы зірнуць на такія этапныя творы, як «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча», якія не толькі сваімі фальклорна-сатырычнымі прыёмамі, але ўжо дзе-нідзе і структурна, сваёй «складнасцю», арганізацыяй нярэдка падрыфмаванага радка ўжо недзе змыкаюцца з будучым сатырычным вершам.

Дзякуючы народнай мове з яе багаццем вобразна-паэтычных сродкаў, што жывым струменем урываліся ў абмялелае рэчышча тагачаснай літаратуры, завяршаецца ў першай палавіне XIX ст. канчатковы разрыў літаратуры з царкоўна-схаластычнымі традыцыямі. Гэты разрыў найлепшым чынам засведчан парадыйна-сатырычнымі паэмамі «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».

Важкасць і цікавасць працы М. Грынчыка, можа, найбольш у тым і заключаецца, што ў святле пастаўленай тут шырокай праблемы мы ахвотна перачытваем, здавалася б, даўно знаёмыя творы і адкрываем у іх нешта такое, што раней выпадала з-над увагі. Пра што б ні гаварыў даследчык, — пра парадыйна-сатырычныя паэмы ці паэтычныя творы Дуніна-Марцінкевіча, пра паэзію Багушэвіча ці Купалы, — заўсёды на першым плане «буйным кадрам» падаецца своеасаблівая «зрошчанасць» вуснапаэтычнай творчасці з той прафесійнай паэзіяй, што толькі станавілася на цвёрдыя ногі. У характары гэтай зрошчанасці, у ступені творчага асэнсавання фальклорных традыцый тоіцца для даследчыка тыя сляды, па якіх ён разглядае заканамернасці літаратурнага развіцця, яго важнейшыя этапы.

Зыходзячы з гэтага крытэрыя (меры мастацкага фальклярызму), аўтар з поўным правам вылучае перыяд нятворчых рамантычна-фальклорных захапленняў у асобны раздзел з дакладнай назвай: «Рамантычны этнаграфізм». На гэты перыяд прыпадае творчасць пісьменнікаў т. зв. «беларуска-польскай школы» — Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага і інш. Гэта дзякуючы іх шчырай зацікаўленасці да свайго народа, да яго фальклору пачаў зараджацца дужа плённы для пачатку «культ народнай паэзіі». Славутыя «Песні сялянскія з-пад Нёмана і Дзвіны», сабраныя Чачотам пасля дзесяцігадовага выгнання, складаюць, па словах даследчыка, цэлую эпоху ў вывучэнні і папулярызацыі вуснай паэзіі беларускага народа. Яны з'яўляюцца сапраўдным прадвеснікам зараджэння новай беларускай літаратуры.

Ацэнка дзейнасці Чачота, як бачым, дадзена надзвычай высокая — і тут М. Грынчык наўрад ці перабольшвае. У спрэчцы з польскім літаратуразнаўцам Алінай Віткоўскай, якая расцэньвае чамусьці працу Я. Чачота як «сумную, прытым амаль прымусова навязаную ненядзоўскую місію», мы, вядома, на баку нашага аўтара. Падкупленыя яго логікай і пафасам даследчыцкай думкі, мы цалкам пагаджаемся, што збор і публікацыя Чачотам беларускіх паэтычных твораў ва ўмовах забароны роднага друкаванага слова, калі нават і фальклор быў вымушан жыць «пад чужым імем» у польскай паэзіі, сапраўды з'яўляліся глыбока ўсвядомленым патрыятычным подзвігам.

Дзейнасць другіх паслядоўнікаў рамантычнага этнаграфізму (Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага) была па сваёй значнасці і ролі далёка неаднолькавай, часам супярэчлівай, яна спалучала ў сабе як элементы прагрэсіўна-дэмакратычныя, так і кансерватыўныя — апошнія праявіліся ў жаданні прымірыць маёнтак і вёску, а таксама ў ідэалізацыі далёкай старажытнасці. Хочацца толькі зазначыць, што такой ідэалізацыі спрыялі тады многія аб'ектыўныя прычыны, і не заўсёды іх можна ставіць у віну таму ці іншаму пісьменніку. Нават больш: ідэалізацыя мінулага напярэдадні абуджэння нацыянальнай свядомасці часам станавілася з'явай заканамернай. Аб гэтым сведчыць прыклад балгар, чэхаў, сербаў.

Рамантычна - этнаграфічная плынь найбольшага «разліву» дасягнула ў творчасці Дуніна-Марцінкевіча. Да яго паэзіі М. Грынчык падыходзіць з тым жа ключом мастацкага фальклярызму і гэтым ключом «адкрывае» тры асноўныя этапы творчай эвалюцыі пісьменніка: пачатковы, калі фальклярызм абмяжоўваўся ў асноўным маральна-бытавой праблематыкай і меў пераважна дэкарацыйны характар («Сялянка»); другі этап, калі фальклорныя матывы (у «Вясковых гісторыях») апрацоўваліся больш творча, на рэальным грунце народнага побыту, з улікам і некаторых сацыяльных праблем («Вечарніцы», «Гапон»); і трэці этап, калі пісьменнік зрабіў канчатковы паварот да рэалістычна-бытавой праблематыкі («Шчароўскія дажынкі», «Травіца брат-сястрыца»). Творчая эвалюцыя Марцінкевіча праходзіла ў рэчышчы перадавых мастацкіх ідэй часу. Яго паэзія адкрывала свету вялікія паэтычныя вартасці народнага слова, душу прыгоннага селяніна, носьбіта высокіх маральных і эстэтычных якасцей. Творчасць Марцінкевіча азнаменавала сабой цэлую паласу ў культурным жыцці нашага краю.

Свой падыход у М. Грынчыка і да праблемы станаўлення беларускага рэалізму. Гэтая праблема, як мы ўжо казалі, не раз грунтоўна распрацоўвалася нашымі літаратуразнаўцамі, але, «зайшоўшы» да яе з пункту гледжання фальклорных традыцый, даследчык адкрыў новы ўдзячны матэрыял для плённага працягу размовы. У полі зроку М. Грынчыка аказаліся, напрыклад, нацыянальныя вытокі паэзіі Ф. Багушэвіча, творчая пераемнасць яго лепшых здабыткаў з мастацкімі запаветамі Марцінкевіча, а таксама такія катэгорыі, як народнасць і нацыянальнасць у трактоўцы Багушэвіча. Пры гэтым найбольшы акцэнт даследчык робіць на новай меры мастацкага фальклярызму ў творчай практыцы Багушэвіча.

Творчы падыход да фальклору, як гэта даводзіць М. Грынчык, заключаецца перш за ўсё ў тым, каб перапрацаваць і ўзбагаціць фальклорныя матывы і вобразы, узняць іх да ўзроўню агульнанацыянальнага і праз іх да агульначалавечага. Менавіта да такога разумення ўпершыню ў беларускай літаратуры прыйшоў Ф. Багушэвіч. Адштурхнуўшыся ад фальклорных асноў, ён умеў нярэдка ўзняцца да значных сацыяльна-філасофскіх абагульненняў. Традыцыйнае і наватарскае ён паяднаў звычайна шляхам арганічнага пераўвасаблення, выступаючы ад імя мужыка з яго нібы прастадушнай наіўнасцю. Аднак гэта не азначае, як лічаць некаторыя крытыкі, што Багушэвіч выпісаў быццам бы адзін псіхалагічны тып беларускага селяніна. У многіх творах паэта жыццёвае і псіхалагічнае напаўненне вобразаў далёка не адно і тое ж.

Стыхія народнай паэзіі жывіла таксама і творчасць Я. Лучыны, А. Гурыновіча, Ф. Тапчэўскага, А. Абуховіча, яна стала дзейсным сродкам паглыблення народнасці і ўзбагачэння жанрава-стылявой разнастайнасці паэзіі.

Пачатак XX ст. прывёў да нечуваных, якасна новых зрухаў у нашай літаратуры. Папярэднія стагоддзі былі толькі дзяцінствам яе развіцця. Якіх жа волатаў слова навінна была нарадзіць новая эпоха рэвалюцый, каб шляхам паскоранага развіцця яны ўзвялі нашу літаратуру ўпоравень з развітымі літаратурамі свету! За гэтую тытанічную працу ўзяліся Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч.

Аглядаючы той час з вышыні сягоднішніх дзён, даследчыкі будуць яшчэ доўга гадаць якія ж сілы так буйна ўскаласілі іх талент? М. Грынчыка, у прыватнасці, цікавіць адно з найбольш праблематычных пытанняў: як народна-фальклорныя асновы паспрыялі разгарнуцца творчым індывідуальнасцям, як садзейнічалі яны выспяванню індывідуальных рысаў, мастацкага стылю, творчага метаду.

Шырокая арыентацыя на фальклорныя вытокі не вяла пісьменнікаў да нейкай уніфікацыі. Наадварот, даводзіць даследчык, на гэтай плённай аснове ўзнікалі выключна разнастайныя літаратурна-мастацкія з'явы. У вершах Цёткі, як і ў творчасці іншых пісьменнікаў, пачынаюць, напрыклад, перакрыжоўвацца і ўзаемадзейнічаць розныя арыентацыі — фальклорнага, літаратурнага, жыццёвага характару. Няпросты шлях быў ад паэтызацыі музыкі-будзіцеля (трансфармацыя багушэвічаўскага дудара) да вобраза актыўнага змагара-рэвалюцыянера. Адсюль — рамантычная прыўзнятасць гэтага вобраза, арэол бясстрашша і самаахвярнасці, і дасягалася ўсё гэта нярэдка дзякуючы ўмеламу выкарыстанню паэтэсай народнай стылістыкі. Аднак уплыў народнай эстэтыкі найбольш поўна праявіўся ў самім падыходзе паэтэсы да асвятлення падзей рэвалюцыі. Грамадска - публіцыстычная плынь, нягледзячы на пэўныя рытарычныя крайнасці, была наватарскай з'явай у тагачаснай паэзіі.

На фальклорных асновах была ўзгадавана таксама і паэзія Янкі Купалы. Народная творчасць, па яго ж прызнанні, нямала паспрыяла яго імкненню «жыць беларускімі думамі». На пачатковым этапе творчая свядомасць Купалы яшчэ не адмежавана ад агульнанароднага, яна як бы знаходзіцца на сумежжы індывідуальнага і калектыўнага, слушна заўважае даследчык, і гэтая думка мае, бадай, большую рацыю, чым меркаванне, быццам паэзія Купалы перыяду «Жалейкі» заставалася яшчэ «актам калектыўнага самавызначэння» (Р. Бярозкін). Тэндэнцыя да індывідуальнага самавыяўлення ўжо тады добра акрэслілася ў паэзіі Купалы пад покрывам фальклорнай, песеннай стылістыкі. Аднак часцей за ўсё Купала не запазычвае паэтыку народнай песні, а развівае яе, пашыраючы вобразна-асацыятыўнае багацце верша, «імкнецца да выяўлення чалавечага перажывання ў яго псіхалагічным напаўненні і жыццёвай канкрэтнасці». Адбываецца, такім чынам, цікавы працэс лірызацыі паэзіі Купалы — працэс, які будучы выяўленнем перш за ўсё глыбока асабістых настрояў і перажыванняў паэта, жывіўся яго сацыяльнай свядомасцю, гуманістычным светаадчуваннем. Пры гэтым адносіны Купалы да народнай творчасці былі настолькі арганічнымі і натуральнымі, што аб нейкай знешняй «зададзенасці», як кажа даследчык, аб нейкіх спецыфічных прыёмах уключэння фальклорных элементаў у творчасць пісьменніка цяжка гаварыць, яны ўваходзяць у купалаўскае эмацыянальнае асэнсаванне свету, жывуць у яго этычных прынцыпах і катэгорыях, у яго ацэнцы з'яў і падзей.

Агульны напрамак фальклярызму Я. Коласа даследчык справядліва вызначае як рух ад народнай песні да паглыблення лірызму праз узмацненне экспрэсіўна-выяўленчых сродкаў. Калі ў раннята Купалы характар лірызму непасрэдна блізкі да народнапесеннай стыхіі, то ў Коласа ён ідзе поруч з большай аб'ектывізацыяй чалавечых пачуццяў і настрояў, са схільнасцю да ўнутранай матывіроўкі вобраза, да эпізацыі падзей і гранічнай пластычнасці малюнка, з выключным па тонкасці адчуваннем прыроды. Характэрны для творчасці Коласа і своеасаблівы «этнаграфізм» (асабліва ў вершаваных апавяданнях) — эстэтычная роля гэтага «этнаграфізму» ў тым, каб паўней адлюстраваць самабытны душэўны склад працоўнага чалавека, яго нацыянальны воблік, характар. Эвалюцыя коласаўскага вершаванага апавядання ў ліра-эпічную паэму праходзіла найперш па законах унутранага творчага развіцця паэта, але шмат у чым яна была абумоўлена агульным напрамкам развіцця беларускай і, наогул, славянскай ліра-эпічнай паэзіі.

Незвычайна арыгінальная з'ява ў беларускай паэзіі — фальклярызм М. Багдановіча. Адухоўленасць роднай прыроды ў Багдановіча народжана непасрэдным уплывам народных легенд і міфаў. Важна і тое, што эмацыянальна - рамантычнае ўспрыняцце прыроды ў паэзіі Багдановіча ўсё часцей спалучаецца з глыбокім роздумам аб лёсе абязлюдзенай радзімы («Дождж у полі і холад», «Перад паводкай»), што фальклорны алегарызм у лірыцы паэта памагае выяўленню яго глыбокіх патрыятычных пачуццяў («Разгарайся хутчэй, мой агонь, між імглы»). І ў Багдановіча, адзначае М. Грынчык, была свая эвалюцыя мастацкага фальклярызму. Цыкл «Згукі бацькаўшчыны» ўжо знаменуе пераход паэта ад знешніх сюжэтна-вобразных фальклорных запазычанняў да адлюстравання своеасаблівасцей народнага светасузірання і псіхалогіі, а затым, у наступных творах, — і да сацыяльнай псіхалогіі чалавека.

Плённым было ўздзеянне фальклорнай стыхіі на творчае фарміраванне А. Гаруна, Г. Леўчыка, К. Буйло, Я. Журбы, а таксама Старога Уласа, М. Арла, Л. Лобіка.

Такім чынам, шырока пастаўленая тэма мастацкага фальклярызму дазволіла даследчыку «перачытаць» творчасць вядомых і менш вядомых пісьменнікаў дакастрычніцкай пары, падняць новыя праблемы развіцця беларускай паэзіі.

Адной з такіх праблем, разгледжаных у манаграфіі, з'яўляецца важная і спецыяльна вынесеная ў асобны раздзел «праблема гераічнага і народны эпас». Удзячным матэрыялам для яе распрацоўкі паслужылі М. Грынчыку фальклорна-рамантычныя паэмы Я. Купалы «На куццю», «Адвечная песня», «Сон на кургане», «На папасе», «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», «Сымон-музыка» Я. Коласа, «Максім і Магдалена» і «Страцім-лебедзь» М. Багдановіча.

Праблема фальклярызму і сягоння вельмі надзённая. Яшчэ далёка не вычарпаны нацыянальна-фальклорныя скарбы, пераасэнсаванне якіх у адпаведнасці з новымі сацыялістычнымі ідэаламі з'яўляецца адной з перадумоў сапраўднай самабытнасці і глыбокай народнасці нашай літаратуры. Таму хацелася б, каб М. Грынчык яшчэ не ставіў кропку на дакастрычніцкім перыядзе, а распрацаваў праблему фальклярызму далей, на матэрыяле нашай сучаснай паэзіі.

Мікола АРОЧКА.

М. М. Грынчык. «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. «Навука і тэхніка». Мінск, 1969.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Віктар Дайліда. Была вайна... Апавяданні. Мастак Ю. Архіпаў. 1969 г. Тыраж 14.000 экз. 88 стар. Цана 11 кап.

Д. Жураўлёў. Генадзь Цітовіч. (Біяграфічны нарыс). Серыя «Нашы кампазітары». Мастак В. Юрчанка. 1969 г. Тыраж 4.000 экз. 144 стар. Цана 31 кап.

Аляксей Зарыцкі. Выбраныя творы ў двух тамах. Том 1. Вершы. 1929—1968. Мастакі В. і М. Басалыгі. 1969 г. Тыраж 4.600 экз. 304 стар. Цана 1 руб. 5 кап.

Каракумскія зоркі. Апавяданні туркменскіх пісьменнікаў. Укладальнік Я. Васілёнак. Мастак В. Саналоў. 1969 г. Тыраж 1.700 экз. 248 стар. Цана 40 кап.

Эдуард Карпачоў. Не уцякай ад землетрасення. Апавяданні. На рускай мове. Мастак Л. Дубар. 1969 г. Тыраж 15.000 экз. 120 стар. Цана 18 кап.

Якуб Колас. Раніца ў нядзельку. Вершы, апавяданні, казкі. Укладальнік С. Александровіч. Мастак М. Карпенка. 1969 г. Тыраж 50.000 экз. 224 стар. Цана 82 кап.

Янка Скрыган. Кругі. Выбранае. Серыя «Бібліятэчка беларускай прозы». 1969 г. Тыраж 8.000 экз. 384 стар. Цана 77 кап.

Уладзімір Парахневіч. Вогненыя віхуры. Запіскі партызана. Літаратурная апрацоўка Ул. Жыжэнкі. На рускай мове. Мастак Б. Забораў. 1969 г. Тыраж 75.000 экз. 368 стар. Цана 51 кап.

М. Пахомаў, Н. Дарафеенка, М. Дарафеенка. Віцебскае падполле. На рускай мове. Мастак В. Юрчанка. 1969 г. Тыраж 20.000 экз. 240 стар. Цана 52 кап.

Уладзімір Хадыка. Выбранае. Серыя «Бібліятэчка беларускай паэзіі». Укладальнік С. Шушкевіч. Франтыспіс А. Кашкурэвіча, афармленне В. Юрчанкі. 1969 г. Тыраж 2.000 экз. 160 стар. Цана 58 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Л. Бурак. Пунктуацыя беларускай мовы. Дапаможнік для настаўнікаў і студэнтаў. 1969 г. Тыраж 14.000 экз. 200 стар. Цана 44 кап.

Аркадзій Гайдар. Цімур і яго каманда. Ваенная тайна. Аповесці. «Школьная бібліятэка». На рускай мове. Мастак Г. Скамарохаў. 1969 г. Тыраж 300.000 экз. 192 стар. Цана 42 кап.

Піянерскія песні. Для дзіцячых хораў. Складальнік А. Дзмітрук. 1969 г. Тыраж 10.000 экз. 80 стар. Цана 19 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»

М. Баркоўскі. Рускі славесны націск. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 10.000 экз. 76 стар. Цана 8 кап.

ВЫДАВЕЦТВА БДУ

Пытанні публіцыстыкі. (Зборнік артыкулаў). На рускай мове. Мастак В. Валянтовіч. 1969 г. Тыраж 650 экз. 236 стар. Цана 78 кап.

БЕЛАРУСКІ ЭКСЛІБРЫС

Работы Я. Ціхановіча, А. Тычыны, Я. Красоўскага, Б. Малкіна, В. Ціхановіча.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

ВЕТЭРАНАМ



Комплекс будынкаў, якія вы бачыце на макеце, — гэта інтэрнат для ветэранаў, будаўніцтва якога пачынаецца каля Заслаўскага водасховішча.

Тут паселяцца персанальныя пенсіянеры, героі баёў і працы, якія захочуць пакінуць свае кватэры, каб жыць разам, адной сям'ёю.

На пярэднім плане — два чатырохпавярховыя жылыя карпусы. Іх канфігурацыя прадыктавана рэльефам пляца, імкненнем архітэктараў дабіцца найлепшай асветленасці пакояў сонцам.

Непасрэдна да жылых карпусоў прымыкае грамадскі блок. Тут размесцяцца сталовая і клуб. Яшчэ далей — двухпавярховы лячэбны корпус. Усе карпусы звязаны паміж сабою крытымі пераходамі.

Інтэрнат стаіць на ўзгорку. Калі ўступіць у строй Вілейска-Мінская сістэма, вада падыдзе да самых карпусоў. Пад вокнамі, метраў за пяцьдзесят, будзе бераг новага водасховішча.

Кожны з 200 жыхароў інтэрната атрымае пакой, сямейныя — па два пакоі. Планіроўка жылых карпусоў — аднабаковая, усе пакоі выходзяць вокнамі на пойдзень, а дзверы вядуць у зашклёны калідор-галерэю, падзелены на холы. У кожным холе — камін, куткі для вячэрняга адпачынку.

На асобныя холы падзелена сталовая. Пасля абеду тут можна будзе пасядзець па-сямейнаму, пагаманіць, успомніць былое.

У клубе на другім паверсе будуць не толькі бібліятэка з чытальнай залай, більярдная, пакоі для настольных гульняў, але і пакоі для працы. Архітэктары прадугледзелі ўсё, каб зрабіць адпачынак пенсіянераў актыўным. У грамадскім корпусе размесцяцца кравецкая, у гаспадарчым — сталярная; каля карпусоў — сад, гарод, кветнікі. У лячэбным корпусе будзе зала для гульні ў валейбол і бадмінтон, побач — пляцоўкі для гульні ў кракет і гарадкі. Дарогі з інтэрната вядуць у лес і на возера, у рыбныя і рыбныя мясціны.

Ветэраны баёў і працы будуць забяспечаны ўсімі відамі медыцынскага абслугоўвання. У лячэбным корпусе праектам прадугледжаны водалячэбніца, рэнтгенаўскі і зубаўрачэбны кабінеты...

Аўтар праекта інтэрната для персанальных пенсіянераў — С. Канавалаў (інстытут «Мінскпраект»).

Паэтычная ПАВЕРКА

Канстанцыя БУЙЛО

Янку КУПАЛУ

З дзён юначых да старасці год
Нас нязменная дружба яднала.
І у шчасці, і ў суме нягод
У твой дом я прыходжу, Купала.

А чаму на парог твой заўжды
Я іду з хваляваннем глыбокім!
Мо таму, што на шлях твой шырокі
Я драбнюткія клала сляды!

Як вясёлкі яскравай дуга,
У паэзіі шлях твой адзначан.
Ну, а побач ступала нага
Маёй ціхае музы дзіцячай.

Мае думы ты сціпла збярог
У букеціку «Кветкі курганнай».
Бляск пялёсткаў у росах духмяных
Ты убачыў — цвісці ім памог.

Неўпрыкмет праляцелі гады,
Сівізна маю скронь заснавала.
Ты ж душы маёй блізкі заўжды,
Дружа родны мой, Янка Купала.

■ ■ ■

У душы ўзнікаюць песні гукі,
Бы хваля звонкая плыве.
Мне хтосьці прасцірае рукі,
Кудысьці за сабой заве.

Нібы на крыллях ўвысь узносіць
Дарогай млечнаю да зор,
Аб чымсьці кажа — быццам просіць
Павесці шчыры разгавор.

Сядаю за мой стол рабочы,
Пяро паслушнае бяру,
І ўсё, што сэрца выліць хоча,
Даверу сціпламу пяру.

Піліп ПЕСТРАК

ЕНІСЕЙ

Адважны, шпаркі Енісей!
Перад табой ў цішы стаю
І поўню дум тваёй красе
Я ўсёй душою аддаю.

Імчыш з далёкіх далячынь —
Я ведаю са школьных дзён
Тваю няскончаную плынь,
Як нейкі даўні, ціхі сон...

Тайга павісла над табой...
Яна, магутная ў вяках,
Усё калыхала рокат твой
У тваіх суровых берагах.

І дзе ў таёжным сонме гор
Задума спела ў немаце,
Цяпер тут дзіўны Дзіўнагорск
У песні волатнай расце.

І на абрыве між бяроз
Я ўбачыў постаці прывет...
То Ленін з Шушанскіх дарог
У неабсяжны выйшаў свет.

Душой абняўшы небакрай,
Што над тайгой разліўся ў сінь, —
Вітаў ён залатую рань
У пошуме народных сіл.

Барыс БЕЛЯЖЭНКА

НА БЕРАЗЕ

З далечыні да берага ішлі
Нямыя сосны, быццам да збавення,
Праз хмызнякі, балоты і палі
І паміралі. Толькі збераглі
Сваіх нашчадкаў светлае імкненне.
Яны прыйшлі. Глядзяцца ў ваду
І цешацца. Ці памятаюць толькі,
Як доўга праз нягоды і бяду
Вялі сюды нястомных продкаў крокі!

Падзеі Факты Навіны

□ Агітбрыгада Хойніцкага раённага Дома культуры пабывала з тэматычным канцэртам «Для тых, хто ў полі» ў калгасах «Бальшавік», «Баявік» і «Бальшавіцкая перамога», у саўгасе «Барысоўшчына» і іншых гаспадарках раёна. Поспехам у хлебаробаў карысталіся выступленні артыстаў-аматараў Г. Данец, В. Кірпічэнка, Ц. Жураўскага, Г. Цішкевіча, М. Пабядзінскага.

А. БОНДАР.

□ Работнікі Ляхавіцкай раённай бібліятэкі правялі на кансервавым заводзе вечар на тэму «Табе Ільіч даваў наказ вучыцца камунізму». Цікавыя былі выступленні рабочых прадпрыемства Валянціны Гаўрыльчык, Галіны Пяткевіч, Барыса Чубрыка і культработніка Ірыны Сакуць.

Агляды літаратуры, прысвечанай У. І. Леніну, правялі супрацоўнікі бібліятэкі для навучэнцаў сельгастэхнікума і вучняў другой сярэдняй школы.

М. ДРОБЫШ.

□ Пісьменнікі М. Аўрамчык, В. Вітка, У. Юрэвіч і мастак Я. Раманоўскі сустрэліся з вучнямі і настаўнікамі Прылепскай сярэдняй школы Смалявіцкага раёна. Вучням малодшых класаў Васіль Вітка прачытаў свае казкі, вершы, лічылкі, скарагаворкі. Другая сустрэча адбылася са старшакласнікамі. Уладзімір Юрэвіч расказаў аб пісьменніцкай працы. Паэты М. Аўрамчык і В. Вітка прачыталі вершы, а мастак Я. Раманоўскі падзяліўся ўспамінамі пра народнага песняра Янку Купалу.

В. КАЦУБА.

□ У Магілёве праведзены агляд мастацкай самадзейнасці настаўнікаў горада. У ім прыняло ўдзел больш за 800 работнікаў народнай асветы абласнога цэнтра.

Нядаўна адбыўся заключны канцэрт агляду. Многа песень прагучала ў гэты вечар у выкананні хораў, вакальных ансамбляў, дуэтаў і салістаў. Добра выступілі хоры сярэдніх школ №№ 26, 15 і 12, жаночы вакальны ансамбль 11-й сярэдняй школы. У канцэрце таксама прынялі ўдзел чытальнікі, інструменталісты.

А. ГОЛЫШ.

□ У Мінску адбыўся семінар інспектараў і мастакоў абліннігагандляў і абласных кааперніігагандляў. Абмяркоўвалася пытанне аб формах і метадах рэкламы і прапаганды літаратуры ў кніжным гандлі. Удзельнікі семінара пазнаёміліся з узорамі друкаванай рэкламы, якая выдаецца ў нашай краіне і рэспубліцы, пабывалі ў лепшых мінскіх магазінах.

В. ВАСІЛЬЕЎ.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

АВЯР'ЯНУ ДЗЕРУЖЫНСКАМУ — 50 ГАДОЎ

Споўнілася 50 гадоў паэту Авяр'яну Дзеружынскаму. З гэтай прычыны праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Авяр'ян Сафонавіч!

Ад душы віншуем Вас з пяцідзесяцігоддзем!

Вы дэбютавалі ў літаратуры як паэт-песеннік. З таго часу Вы стварылі ў садружнасці з беларускімі кампазітарамі нямала песень, некаторыя з якіх («Мяцеліца», «Залатыя каласы», «Дзявочая лірычная», «Сабірайся ў госці, мой дзядок» і інш.) набылі шырокую папулярнасць.

Актыўна Вы працуеце і ў жанры дзіцячай паэзіі. «Цуды ёсць на свеце», «Кую, кую ножку», «Смешкі і пацешкі» — гэтыя і другія Вашы зборнікі былі прыхільна сустрэты нашымі юнымі чытачамі.

Не можам мы не адзначыць і тое, што Вы на працягу больш як дваццаці год нязменна працуеце рэдактарам выдавецтва «Беларусь» і шмат энергіі аддаеце рэдагаванню мастацкай літаратуры для дзяцей.

Жадаем Вам бадзёрасці, добрага здароўя, новых песень і вершаў».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага прывітання і жадае юбіляру моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

РУКАМІ НАРОДНЫХ УМЕЛЬЦАЎ

Экспазіцыя гэтага музея размяшчаецца ў трох пакоях абласнога Дома народнай творчасці. Тут прадстаўлены лепшыя творы майстроў усіх відаў народнага мастацтва Гродзеншчыны.

Вось скульптурныя партрэты, выкананыя аматарамі А. Ліпенем, работы разьбяроў па дрэве І. Быка і Г. Чарнова, цікавыя творы Г. Астрамовіча (Ашмянскі раён) — «Юнацтва» і «Сляпы гусляр». Мейстар добра адчувае матэрыял — дрэва, удала скарыстоўвае яго пластычныя і дэкаратыўныя магчымасці. У гордай фігуры старога гусляра ўмелец перадае вобраз песняра роднай зямлі, незгінальную сілу народнага духу.

Арыгінальныя творы гутнага шкла майстра Р. Багінскага: дэкаратыўны посуд «Мядзведзь», «Баран», невялікія фігурні «Модніца», «Чорт», «Індык», у якіх многа гумару, фантазіі.

Трапна перадае майстар «характары» насельнікаў Белавежскай пушчы — касулі, лісы, зайчанят, вожыка.

Найбольш поўна прадстаўлена ў музеі ручнае мастацкае ткацтва. Работы майстрых А. Лянцэвіч, Я. Паўлоўскай, Н. Шафарэвіч (вёска Збляны Лідскага раёна), Н. Новак (Іўеўскі раён), Н. Карповіч (Карэліцкі раён) і многіх іншых уражваюць багаццем фантазіі, маляўнічай гамай фарбаў.

Музей народнай творчасці дапаможа абласному Дому народнай творчасці ажыццяўляць метадычную работу з умельцамі. Яго экспазіцыя пазнаёміць шырокую грамадскасць вобласці з традыцыйным народным мастацтвам розных раёнаў Прынёманскага краю.

Я. ФРАНЦАЎ.

З далёкіх падарожнаў

Кастусь Кірэенка

Другарка Балгарыя

У канцы красавіка — пачатку мая 1969 года ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі знаходзілася савецкая дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Савета Міністраў БССР тав. Р. Я. Кісялёвым. Яна прымала ўдзел у днях балгара-савецкай дружбы, якія праходзілі як народнае свята па ўсёй брацкай сацыялістычнай краіне.

Сваімі ўражаннямі аб паездцы ў брацкую краіну дзеліцца член дэлегацыі паэт Кастусь Кірэенка.

1. ПІСЬМО Ў САФІЮ

Дарагія нашы балгарскія сябры, добрыя людзі, шчырыя, гасцінныя гаспадары цудоўнага балгарскага краю! Дарагія Цола Драгойчава, Свабода Касабава, Эмілія Гергава, Пека Такаў, Пётр Танчэў, Стэфан Васілеў, Ангел Тодараў, Міхаіл Манеў, Пётр Георгіеў, Дэню Папоў, Пенько Георганаў, слаўныя субяседнікі і прыяцелі Мірчо і Коста, Сімеонка і Здраўка, і ты, бабуля Вярушка, што паіла нас вадою па дарозе на Шыпку, і вы, юныя нашы паплечнікі — піянеры, вы, рабочыя Плоўдзіва і Шумена, і вы, хлебаробы Талбухіна і плевенскай Мечкі,— усе, усе, хто сустракаў нас, савецкіх людзей, хлебам-соллю ў гарадах і вёсках Балгарыі, хто вазіў і вадзіў па сонечных балгарскіх дарогах, хто паказваў багатыя плёны сваёй цудоўнай працы, спяваў прамяністыя балгарскія песні... Паклон вам усім і сардэчнае вітанне, пачуйце з Мінска слова гарачага прызнання і вячыстай, брацкай любві...

Цяпер, калі я пішу вам гэтае пісьмо, у Мінску і па ўсёй Беларусі цвітуць-дацвітаюць сады, у ранішніх росах гараць, як бы звоняць сонечнымі званамі, чырвоныя і залатыя цюльпаны, бухматаю ад кветак галавою цягнецца ў светлыя вокны бэз, і пацягнуліся да сонца, закаласіліся жыты, і па ўсяму краю заліваюцца салаўі... Вясна... Пачатак лета... І я ўспамінаю дні красавіка і пачатак мая, дні, калі мы былі ў вас,— тады ў Балгарыі адзяваліся ў белыя і ружовыя ўборы сады, гучна буркавалі на золаках галубы, салаўі прабавалі закаханыя галасы, бурна каціліся плынныя балгарскія рэкі, а паўз дарогі, на бязмежных палетках, як рознакаляровыя вяночкі, свяціліся вясновымі строямі чароды вясковых працаўніц...

Дзве вясны пашчасціла сустракаць мне сёлета, дзякуючы вашаму гасціннаму запрашэнню. Ваша вясна была першай. А першая вясна — як першае каханне. Я люблю свой край, сваю ціхую і грымотную Беларусь, люблю сустракаць яе нястрымныя вясновыя ліўні, яе шапатлівыя світанкі пад клейкай і пахкай лістотай маладых бяроз, яе прывольны, птушыны грай... Але сёлета ўсё захапленне маёй вясною як бы вымяралася і вывяралася адным вялікім захапленнем — радасцю пазнанай разам з вамі дзівоснай балгарскай вясны... Зазвініць на залатых жвірынках ручаінка ў родным лесе — і адразу паўстае прад вачамі ваша цудоўная Віташа — лагодныя горы над Сафіяй; якраз у тыя дні па камяністых каляінах падалі з Віташы серабрыстыя вясновыя патокі, дымяліся пад сонцам заімшэлыя валуны, і свежы вецер з вяршыні сонечна ўрываўся ў нізіны, каб адкрыць за трапяткою смугою чароўныя абрысы балгарскай сталіцы... Або пабачыш, як пад ранішнім променем шчасліва распускаецца ў Мінску бутончык вогненнага цюльпана, — і ўяўляюцца чырвоныя гальштукі піянераў у Плоўдзіве — каля помніка савецкаму салдату, легендарнаму Алёшу: як вогненна дыхалі тыя кветкі, што ўручалі нам гарачыя дзіцячыя рукі, якой светлай адданасцю нашай дружбе свяціліся шчырыя вочы балгарскіх юных ленінцаў!

«Іскатэ лі да гаворя па-быльгарскі?» — зноў і зноў чуецца пытанне Эміліі Герговай, нашай слаўнай другаркі, што, як ласкавая сястрыца, была з намі на ўсіх шляхах падарожжа па Балгарыі. «Іскам!» — хочацца адказаць ёй зноў і зноў. Так, так, другарка Эмілія, дарагая наша настаўніца, мы хочам гаварыць па-балгарску, мы чуем ваш голас, ён не сціхне ніколі, як ніколі не сціхне голас народных сэрцаў, вячысты голас народнага брацтва. І, напэўна, не адзін раз у жыцці ажыве ў нашых пачуццях тая незабыўная дарога вясны, дарога кветак і ўсмешак, вітанняў і шчырых бяседаў, што вяла ад Сафіі ў Плоўдзіў і ў Карлава, у Казанлыкскую даліну і на Шыпку, у Габрава і Тырнава, Шумен і Варну, Талбухін і Плевен, у гарады і вёскі, у палацы і гасцінныя хаты брацкай Балгарыі...

Дарагія балгарскія сябры!

Вы ведаеце, я ўжо не аднойчы гаварыў вам пры сустрэчах, з якой радасцю ехаў я ў Балгарыю. І гэта не толькі таму, што краіна Балгарыя так славіцца ў нашым народзе. Я ехаў да вас у Балгарыю яшчэ і таму, што хацеў праверыць многія свае клопаты і думкі. Як шчырымі і адкрытымі былі мы заўсёды, так шчыра і адкрыта я скажу ўсё і ў сваім пісьме. Вы ж ведаеце, якія хваляванні і трывогі выпалі на долю нашых сённяшніх пакаленняў. Амаль чвэрць веку мінула з таго часу, калі сціхлі грымоты апошняй вайны. Калі мы, салдаты Савецкай Арміі, заканчвалі свае пераможныя баі, то бачылі, якую гарачую любоў дарылі нам народы вызваленай Еўропы. Ніхто не страціў столькі ў барацьбе з фашызмам, як савецкі народ. Толькі ў адной Беларусі вайна забрала больш двух мільёнаў сыноў і дачок. Савецкія людзі ніколі і нідзе нічога не шкадавалі дзеля свабоды і шчасця ўсіх народаў зямлі. Савецкія людзі гатовы на любыя цяжкасці і выпрабаванні — толькі б заўсёды і ўсюды выканаць інтэрнацыянальны камуністычны абавязак, прыйсці на дапамогу сваім працоўным братам і сябрам. Так было ў гады вайны, так было ўчора і ёсць сёння, так будзе заўсёды.

І мы па-сапраўднаму шчаслівыя тым, што народы свету гэта разумеюць і шануюць.

Але ўявіце сабе, якім болем адбіліся ў нашых сэрцах леташнія падзеі ў Чэхаславакіі, дзе раптам здолела тады ўзняць галаву контррэвалюцыя, пагражаючы заваёвам сацыялізма. Пасля вайны я бываў у Чэхаславакіі аж тры разы. Бачыў могілкі савецкіх воінаў у Празе і ў другіх мясцінах, роўныя шарэнгі абеліскаў і чыстыя, усыпаныя кветкамі курганочкі зямлі. Больш ста тысяч савецкіх воінаў загінула за вызваленне Чэхаславакіі. Ці думалі яны, ці думалі іх асірацеўшыя маці і сыны, што над іх геройскімі магілами калі-небудзь прагучыць слова здзеку і паклёпу ў адрас савецкай краіны? А так жа адбылося... З сумам успамінаю я летнія дні 1968 года. Я сяджу ў Мінску перад экранам тэлевізара і адчуваю, як халадзее, ледзянее маё сэрца. Прага... Брацкая Злата Прага... Ці яна гэта?.. Шалее на Вацлаўскай плошчы раз'юшаны натоўп валасатых дзікуноў. Вось на сцяне намалявана чырвоная зорка са знакам свастыкі на ёй. Вось цёкаюць бандыцкія кулі з-за вугла. Вось перакрыўлены ад злосці «супермэн» з патламі нешта агіднае крычыць у вочы савецкаму афіцэру. «Брава! Брава» — кідае ў натоўп правакацыйныя заклікі тлусты, як каплун, Прахазка — адзін з адкрытых агітатараў варожай сацыялізму сілы...

Дарагія сябры, усе мы разумеем, што такія лютыя да сацыялізма прахазкі могуць абявіцца ў любой краіне — іх рыхтавала і можа яшчэ рыхтаваць імперыялістычная агентура, імперыялістычная прапаганда. Але як маглі такія прахазкі знайсці сабе забяспечаны выхад на людныя плошчы? Хто дазволіў імздзекваццa з памяці працоўных народаў — з той памяці, у якой жыве столькі светлай самаахвярнасці ў імя дружбы і брацтва сацыялістычных краін, у імя перамогі сацыялістычных ідэалаў?.. Сёння ўсё гэта перажыта і адышло ў мінулае. Сёння ўсе мы з вялікай радасцю сустракаем сур'ёзныя захады чэхаславацкіх камуністаў у барацьбе за ленінскую кансалідацыю сваёй партыі. Мы шчаслівыя за чэхаславацкі народ, які з дапамогаю брацкіх сацыялістычных

Прыём у гонар дэлегацыі СССР ва Усенародным Камітэце балгара-савецкай дружбы. Выступае член Палітбюро ЦК БКП старшыня Камітэта Цола Драгойчава. Першы злева — К. Кірэенка, чацвёрты — Р. Кісялёў.

народаў здолеў адстаяць свае сацыялістычныя заваёвы... Але ж тады, у трывожныя дні 1968 года, як было горка і крыўдна! Няўжо так лёгка і проста могуць забывацца кім-нікім кроў і подзвігі герояў? — думалася тады. — Няўжо наша душэўная шчодрасць і любасць былі такімі блізарукімі? Няўжо голас таннай, крыклівай папулярнасці можа пабіць сілу пралетарскага гуманізму, пралетарскай еднасці і дружбы?.. Пасля, на паўгода пазней, як вы ведаеце, прагучалі выстралы кітайскіх правакатараў. Савецкі вострaў Даманскі на Усуры паліўся крывёю савецкіх юнакоў, якіх пабандыцку, па-змоўніцку забілі азвярэлыя штурмавікі Мао Цзэдуна... Прызнаюся вам, дарагія сябры, у сэрцы маім сталі мясціцца трывога і крыўда. І не толькі ў маім сэрцы... Калі я прыехаў у вёску да сваёй маці (а яна страціла ў вайне трох родных чалавек!), то ўбачыў яе зажураную і занепакоеную. На стале стаялі дарагія сямейныя фатаграфіі. «Колькі сэрцаў пааддавалі людзям...» — сказала маці і заплакала. І я зразумеў, пра што яна думала. Ёй таксама не верылася, што за мацярынскія слёзы і брацкую любасць можна заплаціць чорнай няўдзячнасцю і глумленнем...

У сваім пісьме я нічога не хаваю ад вас і не таю, дарагія мае балгарскія сябры... З тае хвіліны, калі ў Сафіі прызналіўся самалёт і вы сустрэлі нашу дэлегацыю, — з тае хвіліны я пільна ўглядаўся ў вашы вочы, пільна ўслухоўваўся ў вашы галасы. Мне хацелася як найглыбей зазірнуць у вашы душы. Мне хацелася як найхутчэй самаму, сваім уласным сэрцам, на свае ўласныя пачуцці, убачыць, адчуць і вызнаць праўдзівасць і глыбіню вашай дружбы і вашага брацтва, сілу вашых камуністычных перакананняў...

І вось я сёння пішу вам гэтае пісьмо. Якая радасць для мяне пісаць яго вам як самым шчырым, самым дарагім сябрам! Я смела магу назваць вас братамі вернымі і адданымі нашай агульнай камуністычнай справе і ў гэтым адчуваю вялікае для сябе шчасце. Я бачыў вашы вочы, твары, рукі, чуў вашы галасы і, як мне верыцца, зразумеў вашы сэрцы. І я смела скажу сваёй маці: не журыся, матуля, вернасць жыве, ніякі чорны камень, кінуты варожай рукою, не можа пахіснуць яе жыццядайнай сілы, усё і ўсюды перамажа наша народная еднасць, наша народная любасць і шчырасць!

Па нашаму народнаму звычаю кожнае пісьмо родным ці блізкім людзям прынята заканчваць пажаданнем добрага здароўя і нізкім паклонам. Я з вялікай прыемнасцю выконваю гэты народны наказ. Добрага здароўя вам і нізкі вам паклон, дарагія балгарскія сябры! Але не, я не развітваюся з вамі. Там, дзе глядзіцца ў сіняе неба старажытная і маладая, залатая Сафія, там, дзе па дарозе на слаўную Шыпку зацвілі чабрэцы